

МОЎНЫЯ АСАБЛІВАСЦІ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ РЫБАЛКІ **12**

12

ФОТААРХІЎ ДЗЯДЗЬКІ АНТОНА **13**



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

13 ЛЮТАГА 2019 г. СЕРАДА № 29 (28896)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Аляксандр КОРБУТ, намеснік міністра прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя:**

*«Адным з праблемных пытанняў у сферы абыходжання з цвёрдымі камунальнымі адходамі з'яўляюцца сённяшнія тарыфы, якія не адпавядаюць рэальным эканамічным затратам і не ўлічваюць выдаткаў на засваенне новых тэхналагічных працэсаў. Мінпрыроды прапануе Мінжылкамгасу перагледзець падыход да фарміравання тарыфаў на паслугі па вывазе, абясшкоджванні і перапрацоўцы ЦКА і разгледзець магчымасць арганізацыі ўліку фактычных аб'ёмаў сабраных і вывезеных на захаванне адходаў спажывання ў тонах. Разлік у тонах сярод іншага забяспечыць магчымасць дакладных разлікаў з насельніцтвам па факце, што паслужыць стымулам да раздзельнага збору адходаў. У Мінжылкамгаса ёсць разуменне гэтай неабходнасці».*

# ПАЛАСА ПЕРААДОЛЕННЯ

**НЕЗВЫЧАЙНЫЯ ЗІМОВЫЯ СПАБОРНІЦТВЫ САБРАЛІ НА «ЛІНІІ СТАЛІНА» 200 АМАТАРАЎ ВОСТРЫХ АДЧУВАННЯЎ З УСЁЙ КРАІНЫ**





Удзельнікам прыйшлося пераадолець дыстанцыю, на якой яны паўзлі пад мостам і калючым дротам, пералазілі сцяну, пераварочвалі пакрышкі і пралазілі скрозь іх, беглі праз палатку ў процівагазах і «ныралі» ў люкі танка... Усяго на шасці кіламетрах спартсменаў чакалі 24 перашкоды.

Відовішча атрымалася даволі яскравым. Эмоцыі ўдзельнікаў і балельшчыкаў зашкальвалі. Да фінішу, на якім сапернікаў чакалі ежа, гарачая гарбата і душ, дайшлі ўсе, а атрыманае задавальненне было непараўнальна большым, чым патрачаныя сілы.

**Андрэй САЗОНАЎ, фота аўтара.**

## КОРАТКА

- **Міжнародная спецыялізаваная выстаўка «СМІ ў Беларусі» пройдзе з 2 па 4 мая.**
- У Беларусі рэфармуюць сістэму бухуліку і справаздачнасці сектара дзяржкіравання.
- **КДК прапануе беларусам ацаніць якасць і даступнасць атрымання медыцынскіх паслуг.**



- Набор персаналу для працы на Нежынскім ГУКу плануюць пачаць у 2021 годзе і завяршыць да 2023-га. Усяго будзе працаўладкавана больш за 1,5 тысячы чалавек.

ISSN 1990 - 763X

Месца дзеяння

# ДЗЕ НАРАДЗІЎСЯ — ТАМ І ЗГАДЗІЎСЯ

**Карэспандэнт «Звязды» адправілася ў адзін з самых аддаленых раёнаў, каб пазнаёміцца з мясцовымі жыхарамі і даведацца, чым яны жывуць.**



Фота Ганны КУРАК.

**САЛАМЯНЫЯ ПЕРСПЕКТЫВЫ**

Гэтая гісторыя пачалася ў адной з сувенірных крам Мінска, дзе мне на вочы трапіла шкатулка з саломкі. Вытанчаная і лёгкая, такая ж калісьці была ў бабулі. Унізе на ярлыку значылася: «Хойніцкая фабрыка мастацкіх вырабаў». Калі трымала ў руках гэтую шкатулку, чамусьці падумалася пра людзей, якія яе рабілі. Хто яны? Якія ў іх рукі? Як выглядае працэс стварэння дзівоснай жоўтай скрыначкі?

СТАР. 4

Кожны трэці

Да 75-годдзя вызвалення 1944 2019

# МІЛЬЁНЫ НЕПАЧУТЫХ ГІСТОРЫЙ...

**Народ-змагар. Народ-вызваліцель. Народ, які выстаяў, выцерпеў, не скарыўся. Многа сказана пра ролю беларусаў у Другой сусветнай вайне. Мы часта згадваем пра супраціўленне, падполле, партызанаў. Але ці толькі распаведамі пра подзвігі і герояў можна захоўваць памяць пра Вялікую Айчынную вайну? Нельга забывацца на тое, якія выпрабаванні выпалі на долю нашага народа. На акупаваной тэрыторыі Беларусі нацыстамі было знішчана больш за 2,35 мільёна чалавек, з іх 1,5 мільёна цывільнага насельніцтва! Мы страцілі кожнага трэцяга... Але ці ведае сучаснае пакаленне, як паміралі людзі, якія пакуты даваўлося перажыць простым мірным жыхарам? І наколькі вырастае цана перамогі, калі ведаць, ад якіх жахаў была вызвалена Беларусь? І гэта не толькі канцлагеры і гета, палаючыя вёскі, забітыя дзеці і старыя... Памяць захоўваецца ў распаведах тых, каму ўдалося ацалець падчас акупацыі, у сведчаннях, сабраных Надзвычайнай дзяржаўнай камісіяй па выяўленні і расследаванні злачынстваў нямецка-фашысцкіх захопнікаў, у фатаграфіях, дакументах. Найбуйнейшай скарбніцай такой інфармацыі з'яўляецца Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Разам з ім «Звязда» распачынае новы праект, каб аддаць даніну памяці людзям, якіх забрала вайна...**

СТАР. 5

# ПЕРАД ДЗЯРЖАЎНЫМ ЭКЗАМЕНАМ

## Учора Прэзідэнт правёў кадравыя перастаноўкі

**З'явіліся новыя асобы сярод кіраўнікоў мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў, дыппрадстаўніцтваў, памочнікаў Прэзідэнта — інспектараў. Акрамя таго, змены адбыліся ў кіраўніцтве дзяржаўных органаў, падпарадкаваных беларускаму лідару.**

### Найперш — эканоміка

Так, памочнікам Прэзідэнта — інспектарам па Брэсцкай вобласці былў прызначаны Анатоль Маркевіч, які раней займаў пасаду старшыні Навагрудскага райвыканкама.

Памочнікам Прэзідэнта — інспектарам па Мінску стаў Віталь Прыма, які з 2012 года да 13 лістапада 2018-га з'яўляўся Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Беларусі ў Індыі і па сумяшчальніцтве ў Шры-Ланцы, Бангладэш і Непале.

Таксама беларускі лідар узгадніў прызначэнне Сяргея Федчанкі на пасаду старшыні Навагрудскага райвыканкама. Раней ён займаў пасаду начальніка галоўнага ўпраўлення кантролю за работай аграпрамысловага і прыродаахоўнага комплексаў Камітэта дзяржаўнага кантролю.

Старшынёй Клічаўскага райвыканкама стаў Віктар Рабкавец, раней — першы намеснік старшыні, начальнік упраўлення сельскай гаспадаркі і харчавання гэтага райвыканкама.

«Вам — кіраўнікам раёнаў і памочнікам Прэзідэнта — трэба будзе вырашаць падобныя задачы, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — Задачы няпростыя, я ўжо казаў, на вашы плечы яны лягуць у тым поўным аб'ёме. Два гады, гады перадвыбарныя, таму трэба паказваць людзям, што мы ўмеем вырашаць праблемы. Мы будзем здаваць экзамен у гэтым і наступным годзе».

Прэзідэнт заклікаў не баяцца такіх выпрабаванняў і весці сур'ёзную падрыхтоўку, паказваць людзям сваю здольнасць кіраваць дзяржавай.

Іншы аспект: беларускі лідар звярнуў увагу, што ўсім вышэйназваным давядзецца займацца пытаннямі эканомікі. Ён дадаў, што ў інфармацыйным полі нас палохаюць рознымі пагрозамі, але галоўная, фундаментальная праблема ў любой дзяржаве — эканоміка. «Будзе добра ў эканоміцы — будзе добра ў людзей дома, перш за ўсё — у сем'ях, — падкрэсліў Прэзідэнт. — Таму пытанне нумар адзін для вас усіх — гэта эканоміка».

Яшчэ адзін аспект — сацыяльны. На думку кіраўніка дзяржавы, было шмат зроблена для нармальнага жыцця насельніцтва, працу ў гэтым кірунку трэба працягваць паўсюдна — ад аграгарадкоў да сталіцы.

### Брэст: сельская гаспадарка, прамысловасць, юбілей

Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, прызначаныя кіраўнікі павінны неадкладна прыступіць да выканання абавязкаў.

«Чым больш самастойны памочнік, тым больш ён наводзіць парадак у вобласці і займаецца кадрамі, інфармуе нас пра сітуацыю для прыняцця мер у той ці іншай вобласці, тым больш ён павінен быць падтрыманы мной і вамі (старшынямі райвыканкамаў. — **Аўт.**) Асабліва пры вылучэнні на больш высокую пасаду. Памочнік — гэта асноўны рэзерв Прэзідэнта пры вылучэнні на ключавыя пасады. Таму пачынайце дзейнічаць неадкладна», — падкрэсліў беларускі лідар.

Ён таксама пацікавіўся, наколькі Анатоль Маркевіч знаёмы з Брэсцкай вобласцю. Той адказаў, што знаёмы, паколькі яго Навагрудскі раён мяжуе з ёй, больш за тое — Маркевіч вучыўся ў ВНУ ў Брэсце. Паводле яго слоў, Брэсцкая вобласць развіваецца дынамічна, па ўсіх галінах эканомікі, акрамя сельскай гаспадаркі, ёсць рост. Аднак і сельскагаспадарчыя праблемы вырашыць рэальна.

Прэзідэнт назваў Навагрудскі раён амаль злепкам Брэсцкай вобласці, паколькі і там, і там падобныя праблемы — і па ўмовах надвор'я, і па глебах. Аляксандр Лукашэнка заклікаў звярнуць асаблівую ўвагу на прамысловасць у гэтым рэгіёне, а яшчэ на тысячагоддзе Брэста, так што працы будзе дастаткова.

### Мінск, Навагрудак, Клічаў — бачыць і вырашаць праблемы

Беларускі лідар звярнуўся да Віталя Прымы і адзначыў, што ў Мінску «праблем вышэй даху».

«Вы павінны дакладна, непрадузята паглядзець на Мінск, перш за ўсё — на кадры. І ўбачыць тыя праблемы, якія трэба вырашыць. Зноў жа, экзамен. Два найбуйнейшыя міжнародныя спартыўныя мерапрыемствы — Еўрапейская алімпіяда і матч Амерыка — Еўропа», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Што датычыцца раёнаў, то беларускі лідар указаў на падабенства Навагрудскага і Клічаўскага раёнаў.

Навагрудак ён назваў вельмі важным рэгіёнам Беларусі — і гістарычна, і эканамічна.

«Я абавязкова павінен у Клічаве пабываць, даўно не быў там. Паглядзець трэба гэты раён, няпросты, шчыра скажам. Але сустрэнемся ў гэтым годзе і паглядзім на тое, што вы там зрабілі, што можаце зрабіць, а ў чым, можа быць, трэба і дапамагчы», — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

### «Незаўважная» Іспанія, суседская Польшча

Прэзідэнт таксама прызначыў Паўла Пуставога на пасаду Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла Беларусі ў Іспаніі і па сумяшчальніцтве пастаяннага прадстаўніка Беларусі ў Сусветнай турысцкай арганізацыі. Да гэтага дыпламат быў намеснікам начальніка галоўнага ўпраўлення — начальнікам аддзела Лацінскай Амерыкі галоўнага ўпраўлення Азіі, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі МЗС.

«Што датычыцца Іспаніі, шчыра кажучы, я неяк з пункту гледжання працы МЗС гэтую краіну не заўважаю. Гэта дрэнна, — канстатаваў Прэзідэнт. — Гэта не значыць, што я не ведаю, што такое Іспанія і яе магчымасці. Вельмі добра ведаю, але мы дрэнна працуем на іспанскім кірунку. Таму вам трэба будзе, калі хочаце, закласці трывалы падмурак нашых адносін».

Як адзначыў міністр замежных спраў Беларусі Уладзімір Макей, Павел Пуставой — найлепшая кандыдатура, падбор быў вельмі грунтоўны. Новы пасол — адзін з вядучых спецыялістаў па іспанскамоўных краінах.

Паводле слоў Уладзіміра Макея, тавараабарот з Іспаніяй больш чым 300 млн долараў — гэта не мяжа, апошнія гады ён расце. «Мы перакананыя, што з прызначэннем пасла там мы моцна дабавім», — сказаў міністр замежных спраў.

Ёсць шмат сфер узаемадзеяння, у тым ліку ў прамысловасці.

...Уладзімір Чушаў стаў Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Беларусі ў Польшчы. Раней ён займаў пасаду начальніка ўпраўлення міжнароднага супрацоўніцтва і нацыянальнай бяспекі сакратарыята Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі.

Звяртаючыся да Уладзіміра Чушава, Прэзідэнт адзначыў, што новы пасол ведае спецыфіку адносін з суседняй краінай. «Не скажу, што яны без праблем. Праблем хапае, але ўсе яны абсалютна вырашальныя, і для гэтага трэба зрабіць усё, таму што наступныя гады для беларуска-польскіх адносін будуць вызначальнымі на вялікую перспектыву», — адзначыў беларускі лідар.

Паводле яго слоў, у Польшчы трэба бачыць свой інтарэс, давodзіць да мясцовага істэблішменту і народа беларускую пазіцыю. «Ніякіх пагроз ад нас яны няхай не чакаюць. Але гэта не значыць, што, калі яны будуць бразгаць зброяй, мы будзем на гэта спакойна глядзець», — сказаў ён.

### Дысцыпліна і вынік

Старшыня камітэта эканомікі Гродзенскага аблвыканкама Андрэй Свірыдаў быў прызначаны на пасаду намесніка кіраўніка спраў Прэзідэнта.

«Вас чакае разам з кіраўніком спраў велізарная праца, — падкрэсліў ён. — Жалезная павінна быць дысцыпліна і вынік. Сказана лыжы зрабіць — рабіце, у вас ёсць прадпрыемства. Сказана зямлю капаць — трэба капаць і хлеб вырошчваць».

Аляксандр Лукашэнка таксама звярнуў увагу, што Кіраўніцтва справамі сёння — гэта шматпрофільная арганізацыя, якая займаецца ўсім — ад вытворчасці малака да турызму. Ён заклікаў закручваць гайкі як след і дзейнічаць.

Яшчэ Прэзідэнт узгадніў прызначэнне Аляксандра Мароза на пасаду генеральнага дырэктара ААТ «Мінскі механічны завод імя С. І. Вавілава — кіруючая кампанія холдынга «БелОМА». Раней ён быў першым намеснікам генеральнага дырэктара на гэтым заводзе. Нагадаем, нядаўна стала вядома, што папярэдні гендырэктар холдынга «БелОМА» Вячаслаў Бурскі быў затрыманы і знаходзіцца пад вартай.

«Я вельмі спадзяюся, Аляксандр Іванавіч, вы зробіце пэўныя высновы ў сваім калектыве і ў канцы гэтага года мы ўбачым ашаламляльныя вынікі вашай дзейнасці», — заявіў Прэзідэнт, звяртаючыся да новага кіраўніка.

### Ад пасла да намесніка міністра

Акрамя таго, у рабочым парадку былі ўзгоднены і іншыя прызначэнні. Алег Швец стаў намеснікам міністра архітэктуры і будаўніцтва (раней — намеснік генеральнага дырэктара дзяржаўнага вытворчага аб'яднання «Мінскбуд»). Першым намеснікам старшыні Дзяржаўнага камітэта па стандартызацыі стала Ірына Асмола (раней — дырэктар навукова-вытворчага РУП «Беларускі дзяржаўны інстытут стандартызацыі і сертыфікацыі»).

Кіраўнік дзяржавы прызначыў Алену Купчыну на пасаду Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла Беларусі ў Славеніі, пастаяннага прадстаўніка Беларусі пры Арганізацыі па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе па сумяшчальніцтве. Раней яна была паслом у Аўстрыі і па сумяшчальніцтве ў Харватыі, а таксама пастаянным прадстаўніком Беларусі пры міжнародных арганізацыях у Вене.

Аляксандр Панамароў стаў Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Беларусі ў Харватыі па сумяшчальніцтве, да гэтага ён працаваў у якасці пасла ў Венгрыі і па сумяшчальніцтве ў Босніі і Герцагавіне.

Руслан Есін прызначаны Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Беларусі ў Аўстралійскім Саюзе і Новай Зеландыі па сумяшчальніцтве. Раней ён быў беларускім паслом у Японіі.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.**

### У ТРАГЕДЫІ Ў СТОЎБЦАХ ВІНАВАТЫЯ МЫ ЎСЕ

**Такое меркаванне выказаў кіраўнік дзяржавы наконт трагедыі ў стаўбцоўскай школе, назначаючы памочнікаў Прэзідэнта і даючы згоду на назначэнне кіраўнікоў мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў.**

Нагадаем, школьнік напаў з нажом на настаўніцу і трох вучняў. Жанчына і адзін школьнік не выжылі.

«Я суткі аналізую сітуацыю і ўсякага роду размовы на гэтую тэму. Хто вінаваты? Усе мы вінаватыя. І справа тут не толькі і не столькі ў інтэрнэце, — падкрэсліў ён. — У нас у школах поўны бардак. Ніколі такога не было — ні ў савецкія часы, нават у пераломны перыяд».

Беларускі лідар заклікаў звярнуць увагу на месцы масавага збору людзей, перш за ўсё — дзяцей. «А пры разборы гэтай справы трэба на ўсю катушку спытаць перш за ўсё са старшыні райвыканкама. Гэта яго школа, — сказаў ён. — І з міністра адукацыі — чаму не навялі парадак. Школа — святое месца, як у царкву трэба ісці ў школу. А ў нас што адбываецца ў школах — сорамна нават публічна гаварыць».

Кіраўнік дзяржавы запатрабаваў да свайго вяртання з камандзіроўкі ў Расію далажыць аб тым, што зроблена па навядзенні парадку. Яго асноўны пасыл: павінна быць жалезная дысцыпліна, а яшчэ неабходна захаваць стабільнасць, якая сёння ёсць. Галоўная каштоўнасць — гэта чалавечае жыццё, акцэнтаваў Прэзідэнт.

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Улады Македоніі прыступілі да перайменавання краіны

Урад былой югаслаўскай рэспублікі атрымаў вербальную ноту ад грэчаскага кіраўніцтва аб ратыфікацыі дакумента і выкананні ўмоў для ўступлення ў сілу папраўак да македонскай канстытуцыі. З будынка ўрада ў цэнтры Скоп'я быў прыбраны надпіс «Урад рэспублікі Македонія», раней пачалася замена шыльдаў і паказальнікаў на памежных пунктах, перш за ўсё на галоўным КПП на мяжы з Грэцыяй «Багародзіца» ў рэгіёне Геўгелія на поўдні краіны. Сцяг НАТА ўстанавілі перад офісам Кабінета міністраў. «Службен веснік» (афіцыйны публікатар) агучыць дату ўступлення ў сілу папраўак да канстытуцыі і закона аб іх. Потым рэспубліка Паўночная Македонія і Грэцыя даставяць сумесны ліст генсеку ААН Антоніу Гутэрэшу з датай канчатковага ўступлення ў сілу пагаднення, якім будзе завершана шматгадовая спрэчка паміж дзвюма краінамі», — паведаміў урад. Затым улады Паўночнай Македоніі павінны апавясціць сакратарыят ААН, дзяржавы-члены і краіны-назіральнікі, а таксама міжнародныя арганізацыі аб перайменаванні.

### Прэзідэнт Афганістана гатовы дазволіць талібам адкрыць офіс у краіне



Прэзідэнт Афганістана Ашраф Гані выказаў гатоўнасць даць магчымасць членам радыкальнага руху «Талібан» адкрыць офіс у правінцыі Кабул, Нангархар або Кандагар, перадае Reuters. «Мы забяспечым мір у краіне», — дадаў прэзідэнт. Як адзначае Reuters, Нангархар з'яўляецца апорай талібаў. Згодна з інфармацыяй агенцтва, прадстаўнікі талібаў на мінулым тыдні падкрэслілі важнасць наяўнасці афіцыйнага офіса сярод шэрагу патрабаванняў, якія ўключалі ў сябе зняцце заходніх санкцый, забароны на паездкі сябрам «Талібана», вызваленне зняволеных і спыненне «прапаганды», накіраванай супраць гэтага руху. Афіцыйны прадстаўнік офіса руху ў Досе Мухамад Сахаіл Шахін заявіў агенцтву, што талібы лічаць неабходным прызнанне міжнароднай супольнасцю існуючага ў Катары офіса. Як адзначае агенцтва, 25 лютага ў Катары запланаваны чарговы раўнд кансультацый прадстаўнікоў «Талібана» са спецпрадстаўніком ЗША па Афганістане Залмаем Халілзадам. Перагаворы будуць сканцэнтраваны на тэме рэжыму спынення агню і вывадзе з тэрыторыі краіны замежных войскаў.

### Кітайцы за святы патрацілі ўтрая больш, чым кіпрыёты зарабілі за год

Жыхары Кітая за час тыднёвых вакацый з нагоды Новага года па месяцовым календары здзейснілі 415 мільёнаў паездак па краіне, выдаткаваўшы 513,9 мільярда юаняў (76,21 мільярда долараў). Аб гэтым сведчаць даныя кітайскага міністэрства культуры і турызму. Для параўнання: ВУП Люксембурга (даныя МВФ за мінулы год) склаў каля 69 мільярдаў долараў, Кіпра — 23 мільярды, суседняй з КНР Манголіі — 13 мільярдаў, Чарнагорыі — 5 мільярдаў долараў. Чуньцзэ (Свята вясны, Новы год па месяцовым календары) наступіў у ноч на 5 лютага. Навагоднія ўрачыстасці скончацца пасля Свята ліхтароў (Юаньсяоцзэ, або Дэнцзэ) — на 15-ы дзень першага месяцавага месяца. Афіцыйныя навагоднія святы ў Кітаі завяршыліся 10 лютага. Паводле апытання, праведзенага міністэрствам, падчас вакацый жыхары Паднябеснай аддавалі перавагу традыцыйным культурным мерапрыемствам: каля 40 працэнтаў турыстаў падчас сваіх паездак наведвалі музеі.

Грошы

## АДЗІНЫ ПАДАТАК У МІНСКУ ПАДКАРЭКТАВАЛІ

**У сталіцы з пачатку лютага змяніліся некаторыя стаўкі адзінага падатку для грамадзян, якія не ажыццяўляюць прадпрымальніцкую дзейнасць. Карэкціроўка звязана з абнаўленнем Падатковага кодэкса.**

Самую малую стаўку падатку ў памеры шасці рублёў прадугледзелі пры аказанні паслуг па распілаванні і калонні дроў. Стаўкі падатку за паслугі па вырошчванні сельскагаспадарчай прадукцыі, а таксама па драбненні збожжа і выпасе скаціны па-ранейшаму складуць 19 рублёў, а за паслугі па утрыманні, доглядзе і дрэсіроўцы хатніх гадаванцаў — 26 рублёў.

За каротактэрміновую здачу ў арэнду іншым фізічным асобам жылых памяшканняў у кватэры, у якой больш за два пакоі, а таксама ў аднакватэрных жылых дамах і дачах з лютага трэба будзе плаціць 133 рублі ў месяц (за кожнае жылое памяшканне), а не 145, як было раней. А стаўкі за музычна-забаўляльнае абслугоўванне вяселляў, юбілеяў і іншых урачыстых мерапрыемстваў, наадварот, вырастуць, праўда, на адзін рубель: з 92 да 93 рублёў у месяц.

Тыя, хто займаецца рамонтам гадзіннікаў ці абутку, а таксама зборкай мэблі, павінны будуць заплаціць 33 рублі, настройкай музычных інструментаў — 26, а вытворчасцю адзення і абутку — 63 рублі ў якасці адзінага падатку.

Падатак за рэалізацыю твораў жывапісу, графікі, скульптуры, вырабаў народных мастацкіх рамёстваў, кветак, насення і расады, жывёл (акрамя кацянят і шчанюкоў) па-ранейшаму складзе 73 рублі, а за паслугі па дызайне інтэр'ераў, графічным дызайне, афармленні аўтамабіляў — 97 рублёў.

Адзіны падатак за студзень налічаць па ўстаноўленых у снежні стаўках. У Мінску плацельшчыкамі такога падатку з'яўляюцца больш за 5,7 тысячы чалавек.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## Будуць задаволены ўсе

**XXVIII Міжнародны фестываль мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску» сёлета пройдзе з 8 па 17 ліпеня. Цырымонія ганаровага адкрыцця адбудзецца 11 ліпеня, закрыцця — 15-га. Як заўсёды, гледачоў чакаюць сюрпрызы. Дарэчы, першы з іх — кошт білетаў застанецца на ўзроўні мінулага года і нават паменшыцца.**

Як паведаміў кіраўнік **дырэкцыі «базару» Глеб ЛАПІЦКІ**, упершыню беларускі нацыянальны адборачны тур для ўдзелу ў дзіцячым і дарослым конкурсах вакалістаў пройдзе не ў Мінску, а ў Оршы. А ў сярэдзіне сакавіка ў Рызе адбудзецца аналагічнае аб'яднанае выпрабаванне для талентаў з Латвіі, Эстоніі, Швецыі, Нарвегіі, Фінляндыі, Германіі...

Асаблівасць сёлетняга конкурсу маладых выканаўцаў у тым, што ў Віцебску не будзе паўфіналу. У першы дзень хлопцы і дзяўчаты выканаюць славянскі хіт у суправаджэнні Нацыянальнага акадэмічнага канцэртнага аркестра Беларусі пад кіраўніцтвам Міхаіла Фінберга. У другі дзень — сусветны шлягер у суправаджэнні шоу-балета Алы Духавай «Тодэс».

Арганізатары заінтрыгавалі таксама анонсам канцэрта, прысвечанага юбілею «Песняроў». Што датычыцца зорак, ужо вядома, што прыедуць Валерый Лявонцьеў, Надзея Кадышава, Аляксандр Панаётаў...

Першыя білеты паступяць у продаж 22 лютага. У дырэкцыі падкрэслілі, што падчас фэсту будуць задаволеныя ўсе гледачы, незалежна ад узросту і ўзроўню даходаў.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

Як нас дураць?

## РАСТРАЧВАЛІ ГРОШЫ КЛІЕНТАЎ

### Азартная дырэктар пакарана, служачая банка арыштавана...

**У Гродне вынеслі прысуд дырэктару турыстычнай фірмы, якая прайграла грошы кліентаў на спартыўных стаўках. Паралельна вядзецца следства ў адносінах да служачай аднаго з філіялаў банка ў Бераставіцы. Замест папаўнення валютных рахункаў укладчыкаў, яна клала еўра і долары сабе ў кішэню.**

Завяршылася судовая справа ў адносінах да 31-гадовай экс-дырэктара турфірмы, якая з мая па жнівень 2018 года атрымала ад гродзенцаў 45 тысяч рублёў за арганізацыю адпачынку. Але многія так і не змаглі паехаць па пуцёўках, бо азартная дырэктар патраціла грошы кліентаў, у прыватнасці, на стаўках у букмекерскіх канторах. Кожны з 15 пацярпелых пазбавіўся сумы ў памеры ад шасціста да васьмі тысяч беларускіх рублёў. Страта пацярпелым пакуль не кампенсавана. Днямі суд Ленінскага раёна Гродна вынес прысуд — пяць гадоў пазбаўлення волі з канфіскацыяй маёмасці.

Яшчэ адну ашуканку 1961 года нараджэння нядаўна затрымалі ў Гродзенскай вобласці. Спецыяліст па аператыўна-касавай рабоце аднаго з філіялаў банка ў Бераставіцы паспрабавала збегчы са значнай сумай грошай. Яе затрымалі, арыштавалі, вядзецца следства.

Як расказаў падчас прэс-канферэнцыі **начальнік УУС Гродзенскай вобласці Вадзім СІНЯЎСКІ,** жанчына пераафармляла банкаўскія валютныя рахункі грамадзян — давала падпісваць законныя дакументы, потым іх падмяняла і выдавала на рукі падробныя. Грошы яна выкрадала і выносіла з банка. Следства выявіла 20 чалавек, якія пацярпелі ад яе махінацый. Агульная шкода склала амаль 202 тысячы долараў і 17 тысяч еўра. Супрацоўніца жанчыны заведзена 16 крымінальных спраў. Яшчэ па чатырох справах, шкода па якіх складае 38 тысяч долараў і 2 тысячы еўра, вядзецца праверка.

У сваю чаргу, укладчыкам таксама трэба быць больш пільнымі і адсочваць рух па сваіх разліковых рахунках пры фінансава-валютных аперацыях, нагадваюць праваахоўныя органы.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

Транспарт

## Да Гульняў ужо падрыхтаваліся

**Пра гэта заявіў намеснік прэм'ер-міністра Уладзімір КУХАРАЎ пасля выніковай калегіі Міністэрства транспарту і камунікацый.**

«Трэба з упэўненасцю адзначыць, што транспартны комплекс гатовы да правядзення на высокім узроўні II Еўрапейскіх гульняў. Усе праграмныя дакументы, якія былі падрыхтаваны, або ўжо выкананыя, або знаходзяцца на завяршальнай стадыі», — падкрэсліў віцэ-прэм'ер.

Да Еўрапейскіх гульняў у краіне праводзілася работа па забеспячэнні і арганізацыі перавозак удзельнікаў гульняў. Для перавозкі насельніцтва і балельшчыкаў гарадскім пасажырскім транспартам «Мінсктранс» у гэтым годзе плануе закупіць 200 аўтобусаў і 60 электробусаў.

А **дырэктар Дэпартамента па авіяцыі Мінтранса Арцём СІКОРСКІ** адзначае, што другая ўзлётна-пасадачная паласа ў Нацыянальным аэрапорце Мінск будзе ўведзена ў эксплуатацыю ўжо ў красавіку — маі. Аэрапортам у цяперашні час вядуцца работы па сертыфікацыі ўзлётна-пасадачнай паласы, тэхнічна вельмі складанай.

Арцём Сікорскі дадаў, што вялікая ўвага аддаецца гатоўнасці аэрапорта да прыёму гасцей і спартсменаў II Еўрапейскіх гульняў. У прыватнасці, да 1 мая аэрапорт плануе ўстанавіць 10 стоек для самарэгістрацыі багажу Drop-Off, якія сумесна з кіёскамі самарэгістрацыі будуць утвараць адзіную сістэму. Укараняецца сістэма мабільных пасадачных талонаў і паслуга Fast Track. Гэтыя мерапрыемствы, паводле яго слоў, дазволяць забяспечыць высокі ўзровень абслугоўвання пасажыраў, камфортнасць і бяспеку іх знаходжання ў аэрапорце, а таксама скараціць час іх абслугоўвання.

**Сяргей КУРКАЧ.**

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

### ПА СУСВЕТНЫХ СТАНДАРТАХ

**Мінпрыроды падтрымлівае будаўніцтва завода па спальванні смецця.**

Аб гэтым заявіў журналістам **намеснік міністра прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Беларусі Аляксандр КОРБУТ**.

Па статыстыцы, прыкладна 25 % адходаў у свеце ўтылізуюць, а 50—55 % — спальваюць. У нашай краіне таксама ёсць неабходнасць знішчыць смецце. Ужо абвешчаны тэндар на будаўніцтва завода, работы могуць пачацца ўжо ў гэтым годзе. Па словах намесніка міністра, пры падрыхтоўцы тэхнічнай дакументацыі павінны быць улічаны ўсе экалагічныя патрабаванні, адным з асноўных з'яўляецца наяўнасць адмысловых фільтраў і сістэм ачысткі.

Аляксандр Корбут таксама адзначыў, што сёння ёсць інвестыцыйная прапанова, якая дазволіць стварыць прадпрыемства па перапрацоўцы ў Рэспубліцы Беларусь ПЭТ-пакетаў. Намеснік міністра выказаў надзею на тое, што ў найбліжэйшы час такое прадпрыемства будзе працаваць. «Акрамя таго, мы прапануем канцэрну «Белхарчпрам» выключыць з выкарыстання тыя поліэтылены, якія не перапрацоўваюцца».

**Вольга ПРАЛЮК.**

### ДАЕХАЦЬ ДА ЛЕГЕНДАЎ БУДЗЕ НЕСКЛАДАНА

**«Мінсктранс» арганізуе дастаўку балельшчыкаў на «Гонку легендаў» і чэмпіянат Еўропы.**

У мэтах забеспячэння дастаўкі гледачоў з Мінска да месца правядзення фестывалю і адкрытага чэмпіянату Еўропы па біятлоне ў РЦАП «Раўбічы» 18, 20, 21, 23, 24 лютага будзе арганізавана работа прыгараднага экспрэснага маршрута № 449Э «станцыя метро «Барысаўскі тракт» — Раўбічы» і прадугледжана адпраўленне аўтобусаў ад прыпыначнага пункта «станцыя метро «Барысаўскі тракт» з інтэрвалам руху 10—15 хвілін у перыяд:

18.02.2019 з 15:00 да 19:00;
20.20.2019 з 14:00 да 20:00;
21.02.2019 з 14:00 да 19:30;
23.02.2019 з 9:00 да 19:30;
24.02.2019 з 9:00 да 15:30.

Пасля заканчэння мерапрыемстваў 18, 20, 21, 23, 24 лютага адпраўленне аўтобусаў ад канчатковага прыпыначнага пункта «Раўбічы» будзе арганізавана па напаўненні салонаў. Час паездкі ад станцыі метро «Барысаўскі тракт» да РЦАП «Раўбічы» складзе каля 30 хвілін.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**

### ДЗЕ ПРАПІШУЦЦА БЮДЖЭТНЫЯ АВІЯКАМПАНІІ?

**Міністэрства транспарту і камунікацый прапрацоўвае пытанне стварэння базавага аэрапорта для лаўкост-кампаній у адным з абласных цэнтраў. Пра гэта паведаміў міністр транспарту і камунікацый Аляксей АЎРАМЕНКА на выніковай калегіі свайго ведамства.**

У апошні час у нас у краіне вялікая ўвага аддаецца развіццю абласных аэрапортаў. «Асноўны акцэнт робіцца на стварэнні рэгіянальных паветраных гаваняў з пункту гледжання прыцягнення туды і чартарных рэйсаў, і рэгулярных, — сказаў Аляксей Аўраменка. — Цяпер мы прапрацоўваем пытанне базавага абласнога аэрапорта для лаўкост-кампаній, якія ў далейшым могуць прыйсці ў Беларусь».

Пытанне з выбарам рэгіёна пакуль не вырашана. Аднак у першую чаргу лаўкосты прыйдуць у абласныя аэрапорты, такія як Гродна і Гомель, адзначаюць у міністэрстве. Зараз завяршаюцца работы па рэканструкцыі Брэсцкага аэрапорта. «Сёння ён гатовы да работы», — сказаў міністр. Паветраная гавань, паводле яго слоў, цяпер здольная прымаць цэлы шэраг сучасных судоў, у тым ліку Boeing 767.

**Сяргей КУРКАЧ.**

### НА ПРЫПЯЦІ ПЕРАКУЛІЎСЯ АЭРАГЛІСЕР

**Два чалавекі загінулі, аднаго з іх шукаюць.**

У Столінскім раёне за 1,5 кіламетра ад вёскі Семігосцічы на Прыпяці перакуліўся аэраглісер, які перавозіў 11 чалавек. Паводле папярэдняй інфармацыі, аэраглісер са штатным суднакіроўцам выкарыстоўваўся для дастаўкі патэнцыйных адпачывальнікаў на турыстычную базу. Пасля пасадкі ўсіх грамадзян — 11 чалавек (дзевяці кліентаў і двух прадстаўнікоў базы адпачынку), пры адыходзе аэраглісера ад берага па лёдзе і выкананні развароту за 20 метраў ад сушы судна перакулілася і разбурыла лёд, утварыўшы палонку 6—8 метраў у дыяметры. Пры перакульванні аэраглісера тры пасажыры апынуліся пад лёдам, 8 чалавек — на лёдзе. Да прыбыцця ратавальнікаў двух грамадзян выцягнулі відавочцы і ўдзельнікі здарэння, трэці пасажыр 1979 года нараджэння знік без вестак, паведамілі ў МНС.

Брыгада хуткай медыцынскай дапамогі, якая прыбыла на месца здарэння, канстатавала смерць аднаго з выратаваных, 1972 года нараджэння. Другі — 1980 года нараджэння — пасля правядзення рэанімацыйных мерапрыемстваў быў транспартаваны ў бальніцу.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

### ФАТАЛЬНАЯ СЦЯНА

**Праваахоўнікі высвятляюць абставіны гібелі работнікаў прадпрыемства.**



Як паведамілі ў Следчым камітэце, на адным з заводаў сталіцы абрынулася сцяна.

Пры выкананні дэмантажных работ адбылося абвальванне цаглянай часткі будынка на двух работнікаў. У выніку 63-гадовы мужчына загінуў на месцы. Другі мужчына памёр пры дастаўленні ў бальніцу.

На месцы здарэння былі праведзены следча-аператыўныя дзеянні. У мерапрыемствах таксама былі задзейнічаны супрацоўнікі МНС, ДКСЭ і міліцыі.

**Сяргей КУЛАКОЎ.**

# ДЗЕ НАРАДЗІЎСЯ — ТАМ І ЗГАДЗІЎСЯ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Валянціна Іванюценка і Валянціна Быкава называюць сябе «хойніцкімі брагінцамі». Гэта значыць, што родам яны з Брагіна, але ўжо даўно жывуць у Хойніках. Працаваць «на саломку» (так тут кажуць пра фабрыку) прыйшлі на пачатку 80-х гадоў:

— Было весела, народу многа — чалавек 300, не менш. Рабілі ў дзве змены. І план паспявалі выканаць, і ў кіно падчас абеду збегаць на індыйскі фільм. А на выхадных ішлі ў клуб — выступалі як самадзейны калектыў.

Жанчыны ўспамінаюць, што ў той час неверагодна папулярнымі былі саламяныя газетніцы.

— Ох, колькі мы іх перарабілі! Яны тады віселі ў кватэрах па ўсім Савецкім Саюзе. Хадавым таварам былі і пано з выявамі пугачоў.

— У мяне такое на балконе і зараз вісіць, — умешваецца ў размову дырэктар фабрыкі Васіль Мігай. — Столькі гадоў прайшло, а яно не сапсавалася. Якасць!

Чаму саламяную вытворчасць наладзілі менавіта ў Хойніках, ужо ніхто і не ўспомніць. Тут спакон вякоў былі майстрыхі іншага толку — плялі «кароначкі» (так мясцовыя называюць карункі).

— Мы спачатку вучыліся ў старэйшых калег. Былі тэхнолагі, мастакі, якія распрацоўвалі схемы і дапамагалі нам іх засвоіць.

Цяпер жа саломкай на фабрыцы займаецца толькі чатыры работніцы, не лічачы брыгадзіра і тых, хто дома пляце нарыхтоўкі. Фраза «і шавец, і жнец, і на дудзе ігрэц» — дакладна пра іх.

— Машыны салому псуюць, таму ў ліпені з чатырох раніцы мы ў полі. Серп у рукі — і наперад. Жнём кулянямі (снапамі. — **Аўт.**), як нашыя бабулі на пачатку XX стагоддзя. Што сабраў, з тым і будзеш працаваць да наступнага жніва. Іншага табе ніхто не дасць, — расказвае Наталля Гарбатая.

Таму нават узімку памяшканні фабрыкі нагадваюць пра лета. Па-першае, пах жытняй саломы, які чуваць нават у калідорах. Па-другое, паўсюдны светлы колер, які з непрывычкі спачатку сляпіць вочы. Тут салома на сценах, століі, падлозе. Ёй завалены ўсе сталы, яна ў руках майстрых. А калі ў добрае надвор'е сюды трапляюць сонечныя промні, усё пачынае свяціцца быццам знутры.

Нягледзячы на тое, што працэс стварэння саламяных вырабаў — справа творчая, хуткасці на фабрыцы высокія. За змену кожная з работніц паспявае сплесці некалькі, а то і дзясятак сувеніраў, аксесуараў ці прадметаў дэкору.

— Рукі на тое і дадзеныя, каб імі нешта майстраваць. Баляць толькі пасля жгутоў і пляцёнак, бо іх на выцягнутых трэба рабіць. У цэлым скардзіцца няма на што, адзінае — невялікія заробкі, — прызнаюцца жанчыны.

Сярод капелюшоў, анёлаў і лапцей заўважаю з дзясятак маленькіх мяшочкаў.

— А гэта што такое?

— Мяхі шчасця. Вешаеце дома — і шчасце ідзе і ідзе, ідзе і ідзе, — усміхаецца самая маладая з работніц Любоў Герасімава.

Хойніцкіх майстрых, увогуле, можна аднесці да сапраўдных рагатух. Ні на імгненне не адрываючыся ад працы, яны любяць успомніць былое. Так, са смехам на фабрыцы расказваюць, што капялюш іх работы аднойчы прымералі на брусельскага пісаючага хлопчыка: «Гэта ж уявіце сабе, колькі людзей у той дзень убачыла хойніцкую саломку!»

А вось улюбёны са сваіх твораў ні адна з работніц выбраць не можа.

— Калі ўпершыню сядаеш за новую фігуру, то яна і становіцца тваёй любімай. Табе цікава, вынік несумненна радуе. Пасля паўторыш працэс некалькі разоў і зачараванасць знікае, — адкрывае прафесійныя сакрэты Люба.

Што цікава, цэны на саламяныя вырабы ў крамах даволі высокія. У Мінску за капялюш прыйдзецца заплаціць 50 рублёў, за талерку для фруктаў — каля 70, невялічкія дэкаратыўныя козы, парсючкі і бычкі — 40—50. Кошты на аналагічныя пазіцыі за мяжой нават называць не буду. Там яны даходзяць да сум, якія раўняюцца з месячным заробкам хойніцкіх майстрых. Пры гэтым самі жанчыны ад кожнай прададзенай рэчы атрымліваюць літаральна капейкі. Чаму так? Дырэктар фабрыкі разводзіць рукамі: «Рынкавая эканоміка...»



## ПРАЦАВІТЫЯ ПЧОЛЫ І ФАТАГЕНІЧНЫЯ ЗУБРЫ

У тэлефоне Міхаіла Рубашчанкі, дырэктара Палескага дзяржаўнага радыялагічна-экалагічнага запаведніка, сотні здымкаў, якім могуць пазайздросціць самыя аўтарытэтныя фатографы, што спецыялізуюцца на дзікай прыродзе. Алені, лосі, касулі, ваўкі і нават коні Пржэвальскага знятыя крупным планам на фоне пейзажаў, не кранутых чалавекам. Здаецца, быццам жывёлы спецыяльна пазіравалі на камеру.

— Можа, і пазіравалі. Яны тут усіх супрацоўнікаў у твар ведаюць, — з усмешкай зазначае Міхаіл Міхайлавіч. — Бо мы адзіныя людзі, якіх яны бачаць апошнія 30 гадоў.

З беларускага боку запаведнік раскінуўся на тры раёны — Брагінскі, Хойніцкі і Нараўлянскі. Тэрыторыя (больш за 200 тысяч гектараў) дзеліцца на дзве зоны — уласна запаведную, дзе, акрамя супрацьпажарных мерапрыемстваў, нічога рабіць нельга, і эксперыментальна-гаспадарчую, дзе працуюць, як і ў звычайным лясгасе, але прытрымліваючыся строгіх нормаў і парадкаў.

— Да нядаўняга часу ў нас было толькі чатыры напрамкі дзейнасці: дрэванарыхтоўка, дрэваапрацоўка, конегадоўля, пчалярства. Хутка сумеснымі сіламі з навукоўцамі будзем закладваць эксперыментальны сад. Папярэднія даследаванні ўжо зробленыя — атрымалі дабро. Ёсць дазвол і на паляўнічтва, рыбалку. Зразумела, толькі на пэўных участках тэрыторыі. А са снежня пачаліся першыя навукова-пазнавальныя экскурсіі. Паказаць ёсць што — адных толькі зуброў больш за паўтары сотні, палова з іх без боязі прыходзіць на падкормку. Хоць бяры ды гладзь па галаве! — жартуе дырэктар запаведніка. — Раней іх тут не было зусім. На пачатку 90-х усяго 17 асобін прывезлі з Белавежскай пушчы. Палескія мясціны старажытным жывёлам прыйшліся даспадобы, вось і пачалі пладзіцца, а пасля разбівацца на статкі.

Спадабаецца ў запаведніку і турыстам-ласунам. Пра мясцовыя пчальнікі слава разышлася ўжо па ўсёй краіне.

— Мёд мы нікуды не прадаём. Летась тры тоны свае ж людзі разабралі ў імгненне вока. Нават кропелькі не засталося. Народ не падманеш: яны ведаюць, што тут яго ніхто з вадой не бадзяжыў, — расказвае Міхаіл Міхайлавіч. — Дарэчы, не так даўно ў раён прыязджаў Мікалай Валуеў. Былы спартсмен з задавальненнем не толькі паласаваўся нашым мядком, але і папрасіў некалькі літраў дадому.

## «МАЛОЧНЫХ ВОЙНАЎ» НЕ БАІМСЯ

Пры знаёмстве жыхары Хойнікаў падкрэсліваюць сваё паходжанне. Людзі з асаблівым гонарам заўважаюць, што яны «карэнныя і ніколі адсюль не з'язджалі».



Коні Пржэвальскага — нярэдкія госці вёсак на Хойнікаўшчыне.



Каму мяшочак шчасця?

Іх можна зразумець: пасля катастрофы на ЧАЭС усе тутэйшыя мелі магчымасць пераехаць. Многія ёй скарысталіся, але ж многія і засталіся.

— Жыць і працаваць трэба там, дзе нарадзіўся, — вучылі мяне з дзяцінства, — кажа Ганна Вяргейчык, вядучы інжынер па якасці на Палескім вытворчым участку прадпрыемства «Мілкавіта».

Сёння, гледзячы на маладую жанчыну ў дзелавым касцюме і стылёвых акулярах, немагчыма паверыць, што калісьці яна была звычайнай рабочай 3-га разраду.

— З маленства я настройвалася на тое, што стану настаўніцай, як бабуля. У школе налягала на гуманітарныя навукі, тым больш што сярод сваякоў — знакаміты Іван Мележ. Здавалася, жыццёвы шлях прадвызначаны. Але ў педагагічны паступіць не атрымалася. Час марнаваць не стала і пайшла на сыраробны цэх у родным горадзе. Гэта зараз мы вырабляем экспартны пармезан і наша сухая сыроватка прайшла экспертызу на вядучых еўрапейскіх прадпрыемствах, а калі я пачынала, пра такое і марыць не маглі. Працэсы былі аўтаматызаванымі толькі часткова. Рукамі пастаянна трэба было нешта падліваць, падмешваць, пераварочваць. Ніколі не забуду, як прыходзілася самой цягаць цяжкія галоўкі сыра на саленне. Зараз з гэтым спраўляюцца машыны — чалавек толькі кіруе.

Па меры таго як развіваўся завод, расла і Ганна ў кар'ерным плане: рабочая — майстар — інжынер. Не адрываючыся ад працы, жанчына атрымала спачатку сярэднюю спецыяльную, а пасля і вышэйшую адукацыі.

— Але галоўнае — на вытворчасці было ў каго пераймаць досвед. У самыя няпростыя гады людзі не збеглі, не кінулі завод, а прыдумалі, як наперакор лёсу застацца на плаве. У свой час Хойніцкі сыраробны камбінат павінен быў стаць адным з самых моцных у Савецкім Саюзе. Па вядомых прычынах планы не збыліся. У канцы 80-х, каб прадпрыемства не закрылася, тут выраблялі тэхнічны казеін. Як паказаў час, не дарма. Хойніцкія сыры і малако не толькі вярнуліся на прылаўкі, але і неаднаразова прызнаваліся найлепшымі. Перш за ўсё таму, што кантроль якасці ў нас больш жорсткі, чым у астатніх. Але ў гэтым ёсць свае перавагі: нават падчас так званых «малочных войнаў» ніякіх прэтэнзій да прадуктаў з нашага краю не было.

## УСЕ ДАРОГІ ВЯДУЦЬ У... ХОЙНІКІ

Мікалай Цыганкоў у Хойніках чалавек вядомы і паважаны, хоць і правёў большую частку жыцця ў далечыні ад Палесся. Падымаў цаліну ў Казахстане, працаваў на будаўніцтве чыгунак у розных рэспубліках былога СССР, узначальваў канструктарскае бюро і нават прычыніўся да пракладання Байкала-Амурскай магістралі. І ўвесь гэты час побач з Мікалаем Мікітавічам была жонка Галіна, таксама хайнічанка. Выйшаўшы на пенсію, ветэран працы і заслужаны будаўнік Расійскай Федэрацыі Цыганкоў не задумваючыся пераехаў на малую радзіму.

На заслужаным адпачынку Мікалай Мікітавіч вярнуўся да хобі, якое займала яго ў маладосці, — вышывання.

— Упершыню за іголку ўзяўся, калі мне было ўсяго 21. Вырашыў зрабіць сюрпрыз жонцы да дня нараджэння — паранёс некалькі сюжэтаў карцін на тканіну. Ёй тады вельмі спадабалася.

Паказваючы свае работы, васьмідзесяцігадовы майстар падкрэслівае: «Я не вышываю, а пішу карціны іголкай. Дзе вы бачылі мужчын-вышывальшчыкаў?»

Сёння калекцыя Мікалая Цыганкова налічвае дзясяткі карцін. Здзіўляюць яны не толькі бездакорнасцю выканання, але і маштабамі. Каляровыя палотны памерам не меншыя за метр у даўжыню ўпрыгожваюць дамы блізкіх Мікалая Мікітавіча, яго родную школу, Хойніцкі раённы краязнаўчы музей. У музеі, дарэчы, у канцы месяца адкрыецца выстаўка да юбілею майстра.

**Ганна КУРАК.**

*Мінск — Хойнікі — Мінск.*

# МІЛЬЁНЫ НЕПАЧУТЫХ ГІСТОРЫЙ...

(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар.)

***— «Кожны трэці»... Ці правільна для Беларусі ацэньваць колькасць ахвяр толькі ў гэтых лічбах? Вайна — гэта не толькі тыя, хто загінуў...***

— Сапраўды, мала падаваць выключна статыстыку, гаварыць пра разбурэнні, страты. Вайна закранула кожнага, у тым ліку, псіхалагічна. Колькі зламаных лёсаў! Калі на вачах дзіцяці забіваюць маці ці бацьку (ці наадварот бацькі страчваюць дзяцей), гэта жудасная карціна, траўма на ўсё жыццё. Цяжка ўявіць, як з гэтым чалавек пасля жыў. А такіх выпадкаў у гады вайны ў нас былі тысячы, — заўважае **загадчык аддзела навукова-даследчыцкай работы Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны Наталля ЯЦКЕВІЧ.**

***— Магчыма, пры патрыятычным выхаванні не хапае такіх расказаў пра вайну, як пра асабістыя трагедыі пэўных людзей?***

— Адразу пасля вайны было не да эмоцый ці капанняў у чалавечай душы. Дзесяцігоддзі пасля вызвалення людзі гаварылі аб перамозе. Але сёння якраз здзейснены паварот у бок эмацыянальнага, асобаснага ўспрымання. Якія цікавыя сталі з'яўляцца мастацкія фільмы і творы! Можна згадаць пра кнігі Васіля Быкава, Святланы Алексіевіч, дзе паказана душа чалавека, яго эмоцыі на вайне. Я была сведкай і ўдзельніцай гэтага павароту, які пачаўся ў 90-х гадах. Напэўна гэта было звязана са зменамі ў грамадска-палітычным жыцці. Перастаў існаваць Савецкі Саюз, мы атрымалі больш магчымасцяў разглядаць гісторыю сваёй краіны, канкрэтна беларусаў ці людзей, якія аказаліся на тэрыторыі Беларусі. У гэты час архівы сталі больш даступныя, людзі пачалі гаварыць пра мінулае больш адкрыта. У дзевяностыя-двухтысячныя гады вельмі моцны прарыў адбыўся ў вывучэнні гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. І сёння мы нашмат больш ведаем, ці маем магчымасцяў, каб адкрываць нешта новае. У нас ёсць кантакты з калегамі з іншых краін. Гэта таксама адыграла немалаважную ролю ў папаўненні ведаў пра Другую сусветную і Вялікую Айчынную вайну.

***— Сёння мы добра ведаем пра Трасцянец, хоць яшчэ гадоў пяць таму ўдзельнікі аднаго з круглых сталоў "Звязды" скардзіліся, што няма сур'ёзных даследаванняў, прысвечаных гэтаму найбуйнейшаму лагеру смерці ў Беларусі. Пра якія яшчэ месцы масавага забойства варта згадаць, прысвяціць даследаванні, паставіць помнікі, улічваць пры распрацоўцы тэматычных экскурсій?***

— Такіх кропак на тэрыторыі Беларусі бясконцая колькасць. У нас няма жывога месца, дзе б не пакутавалі людзі, не гінулі савецкія воіны і мірнае насельніцтва. Тут неабсяжная прастора для дзейнасці нашых навуковых супрацоўнікаў і тых, хто глыбей бы хацеў даведацца пра вайну. Падчас экскурсіі ў нашым музеі мы называем лічбу — 260 лагераў смерці і месцаў масавага знішчэння. Столькі было даследавана і выведзена па звестках Надзвычайнай дзяржаўнай камісіі БССР. У нас у экспазіцыі ёсць карта месцаў гібелі савецкіх ваеннапалонных і цывільнага насельніцтва. Гаворка ідзе аб сотнях, тысячах і дзясятках тысяч людзей.





***— Так, пра месцы, дзе адбываліся масавыя забойствы, можна адшукаць інфармацыю. Але людзі гінулі ў турмах, падчас аблаў, іх забівалі на вуліцы і ва ўласных дамах... Ці былі падлічаны гэтыя ахвяры?***

— З гэтым значна больш складана. Часам звяртаюцца па дапамогу людзі, якія гавораць, што ў пэўнай вёсцы ці горадзе загінуў іх сваяк і гэта бачылі суседзі. Але ніякіх дакументаў, якія гэта пацвярджалі б, не захавалася. Выпадкаў, калі людзей расстрэльвалі індывідуальна ці невялікімі групамі, падчас вайны была маса. Калі гэта не зафіксавана ва ўспамінах ці мясцовыя жыхары не адзначылі месца помнікам, калі інфармацыя не адклалася ў сям'і пацярпелых, вельмі складана ўзнавіць падзеі.

У 90-я гады вялікую работу правяла спецыяльная камісія Дзяржаўнага камітэта па архівах і справаводстве Рэспублікі Беларусь. І я была членам гэтай камісіі, у задачу якой уваходзіла выяўленне іншых месцаў знішчэння людзей на тэрыторыі Беларусі, нават індывідуальных. У 2001 годзе выйшаў даведнік, дзе побач з буйнымі месцамі пазначаны і невялікія: турмы, працоўныя лагеры, гета, якія размяшчаліся ў розных населеных пунктах. У асноўным выяўленне вялося па афіцыйных крыніцах, архівах, музеях... Часам ёсць успаміны, спасылкі, згадкі ў архівах, што ў пэўным месцы размяшчалася, напрыклад, турма, але не хапае інфармацыі пра тое, колькі людзей там загінула. Вялікую дапамогу ў пошукавай рабоце зараз аказвае серыя гісторыка-дакументальных хронік гарадоў і раёнаў Беларусі «Памяць». Пошукавую дзейнасць трэба працягваць. Яшчэ многа захоўвае чалавечая памяць, у тым ліку ў сям'і. Не ўсе матэрыялы архіваў вывучаны. Гэта праца яшчэ не аднаго пакалення.

***— Перамогу кавалі не толькі на палях бітвы. Дзеля яе людзі рызыкавалі сваім жыццём і на акупаванай тэрыторыі. Сярод ахвяр вайны багата невядомых герояў. Пра іх таксама трэба гаварыць...***

— Мне падабаецца, што адначасова праводзіцца такая работа ў многіх школах. У нас дастаткова многа зваротаў ад вучняў, якія распрацоўваюць нейкую тэму, напрыклад, збіраюць інфармацыю пра пэўных удзельнікаў ваенных падзей. Добра, калі школа носіць імя героя. Тады з пакалення ў пакаленне дзеці даведваюцца больш пра вайну, у тым ліку і праз лёсы герояў. Ствараюцца мікрараёны, будуюцца новыя школы — і ўхвальна, калі дзеці і настаўнікі звяртаюцца да нас, каб больш пачуць пра людзей, у гонар якіх былі названыя вуліцы, побач з якімі размяшчаецца навучальная ўстанова. Мы дапамагаем школам ствараць стэнды і экспазіцыі, перадаём копіі матэрыялаў, фатаграфій, якія ў нас ёсць, праводзім па сваім музеі, паказваем на прыкладзе, як мы робім выстаўкі ці пастаянную экспазіцыю.

***— Заraz школьнікі, краязнаўцы, грамадскія арганізацыі яшчэ спрабуюць запісваць гісторыі сведак Вялікай Айчыннай. Але тое, што збяруць сёння, і тое, што ўдалося захаваць дзякуючы рабоце работнікаў музея, — непараўнальныя рэчы.***

— З аднаго боку, калі інфармацыя збіралася па гарачых слядах, людзі помнілі дэталі. А з другога, былі рэчы, пра якія адразу пасля вайны альбо не хацелі пісаць, альбо не маглі з нейкіх прычын. Быў такі выраз «пісаць у стол», і людзі пісалі ў надзеі, што, магчыма, некалі гэта стане вядома ці даступна.

***— Што могуць зрабіць сем'і, каб інфармацыя пра вайну, якую яны захоўваюць, не знікла?***

— Калі ёсць дакументы перыяду вайны, у першую чаргу іх трэба адсканіраваць. Папера таго часу вельмі дрэннай якасці, тэксты знікаюць, заціраюцца. Арыгіналы лепш перадаваць у музеі ці архівы, дзе прафесійна забяспечаць іх захаванасць. У сям'і можна пакінуць копіі. Важныя любыя дакументы: баявыя характарыстыкі, асабовыя справы ўдзельнікаў вайны, прадстаўленні да ўзнагароджвання. Мы прымаем і ўспаміны, запісаныя на паперу (раней ветэраны пісалі іх ад рукі). А сёння такія сведчанні састарэлых людзей іх сваякі могуць надрукаваць, а сам сведка ваенных падзей пасля можа пад тэкстам пакінуць свой подпіс. Зараз жывое пакаленне дзяцей Вялікай Айчыннай вайны, і яны часам звяртаюцца да нас, каб хоць нейкі след застаўся ў гісторыі пра іх бацьку, маці, дзеда. Яны ідуць у дзяржаўныя ўстановы, бо ведаюць, што ў музеі ці архіве захоўванне вечнае, што гэта не прападзе выпадкова, калі не застанецца вартых спадчыннікаў. У выніку мы больш даведваемся пра вайну, пра асабісты ўдзел чалавека, адкрываем новыя прозвішчы. Мы не абмежаваны толькі імёнамі тых, хто ў свой час атрымаў увагу, стаў героем, патрапіў у падручнікі гісторыі, энцыклапедыі, літаратуру — афіцыйную, навуковую і мастацкую. У кожнага, хто перажыў вайну, ёсць свая гісторыя, якую б ён хацеў пакінуць нашчадкам. І тут у нас неаранае поле. Мільёны людзей закранула вайна. А значыць, існуюць мільёны гісторый.

***— І па такія гісторыі можна прыходзіць у музей?***

— Да нас штодзень паступаюць запыты, лісты (палова — праз электронную пошту і сацыяльныя сеткі), і, напэўна, яны ніколі не скончацца. Раней людзі, якія заспелі ў жывых удзельнікаў ваенных падзей, маглі атрымаць інфармацыю напрамую, а зараз вельмі радуе, што ва ўнукаў і праўнукаў ёсць вялікая цікавасць да таго, што адбывалася з іх дзядамі. І мы дапамагаем такім людзям. Значная частка нашай працы — гэта пошук. У нас дастаткова багатыя фонды не толькі прадметаў, дакументаў, але і ўспамінаў. Нашы супрацоўнікі часам спрабуюць нават за межамі музея знайсці інфармацыю, падказаць, куды яшчэ можна звярнуцца.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**
**Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.**



Наш чалавек!

# «НЕ ТУДЫ, ДЗЕ БАЛЮЮЦЬ, А ТУДЫ, ДЗЕ БАЛІЦЬ»

**Людзей, якія б так аддана, так самазабыўна прысвячалі жыццё сваёй любімай справе, сустрэнеш не часта. Але яны — ёсць, на шчасце — у розных сферах дзейнасці і розных кутках краіны. У нас на Бярэзіншчыне гэта (упэўнена, усе мяне падтрымаюць) Тамара Мікалаеўна Круталевіч, загадчыца аддзела маркетынгу раённай бібліятэкі.**



Як на першы погляд, дык сціплая ў яе прафесія, не самая высокая пасада, а вось аўтарытэт...

Гэтая таленавітая, разумная, шчодрай душы жанчына — аўтарка безлічы ідэй, задум і праектаў. Яна ж пры тым — умелы арганізатар, сцэнарыст, рэжысёр, выканаўца галоўнай ролі вядучай, чыя рэдкая эрудыцыя ды выдатнае акцёрскае майстэрства здольныя кожнае з мерапрыемстваў ператварыць у сапраўднае свята.

А іх (прычым самыя розныя — асветніцкія, дабрачынныя) Тамара Мікалаеўна з камандай паплечнікаў ладзіць пастаянна. У выніку нават у такое не зусім і не ўсім зразумелае слова «маркетынг» прыўносяцца дабрыня і клопат, што надзвычай важна цяпер, калі «чалавек матэрыяльны» імкнецца перамагчы «чалавека духоўнага», «чалавека разумнага».

Што тут скажаш: у кожнага пакалення свае густы, свае героі, свае разуменне маралі. І правільна заўважана: у нашых продкаў была мэта жыцця, у нашых бацькоў — сэнс жыцця, а ў нас ды нашых дзяцей — ужо стыль. Вось чаму так важна не спазніцца — своечасова дапамагчы, асабліва маладым, знайсці сваё месца, захаваць чысціню і сумленне, не завесці дурных прывычак.

Менавіта з гэтай прычыны шляхі-дарогі Тамары Круталевіч пастаянна скіроўваюцца ў школы і працоўныя калектывы, каб «ажывіць» чарговую вартую ўвагі кнігу, каб пагаварыць на тэмы «Алкаголь — вораг сям'і», « Быць падлеткам — не проста», «Дзяўчаты ў эпоху рызыкі», каб у Год малой радзімы расказаць пра выдатных землякоў, каб наладзіць сустрэчы з пісьменнікамі і паэтамі, каб з падарункамі наведаць людзей адзінокіх, каб запрасіць маламаёмных у пастаянна дзеючую лаўку рэчаў...

Бярэзінцы ганарацца, што чытаюць артыкулы Тамары Мікалаеўны ў многіх выданнях, чуюць яе голас па радыё, што яна прадстаўлена ў энцыклапедыі «Хто ёсць хто. Жанчыны Беларусі», што на сценах яе рабочага кабінета дзясяткі прыгожых рамак з Ганаровымі граматамі, дыпломамі і падзякамі — «За ўзорнае выкананне службовых абавязкаў», «...Творчы твар бібліятэкі», шматлікія перамогі ў абласных і рэспубліканскіх конкурсах прафесійнага майстэрства, «Жанчына года», «Творчы алімп Міншчыны»...

І гэта, вядома ж, зусім няпоўны пералік адзнак, бо не дзеля іх працуе шаноўная Тамара Мікалаеўна. Яна проста спяшаецца жыць і рабіць дабро.

**Ніна Бурко,**
*в. Капланцы, Бярэзінскі раён.*

Была вайна

# ПЕСНЯ НАРАДЗІЛАСЯ Ў БАЯХ

**Некалі, 75 гадоў таму... Падзеі тых ваенных часоў здаюцца неверагодна далёкімі, але варта пачытаць дзённікі, партызанскія газеты, мемуары, і мінулае наблізіцца, яно ажыве.**

Ва ўспамінах былога партызана Сцяпана Ігнатавіча Лейкі з вёскі Вензавец Дзятлаўскага раёна згадваецца, што пра доблесць і гераізм камсамольцаў і моладзі атрада Дзмітрыя Дзенісенкі народ склаў нямала песень і вершаў, у тым ліку — шырокавядомую «Туман над рекою поднялся»...

Аднак у Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны захоўваецца дакумент, які сведчыць, што аўтарам вершаў да гэтай песні быў не народ. Вячаслаў Антонавіч Хілімонаў пісаў, што партызан з кавалерыйскага атрада Дзмітрыя Дзенісенкі звалі беларускімі казакамі, «міцькаўцамі», што пра іх дзеянні вядомы беларускі пісьменнік і ўдзельнік партызанскага руху Янка Брыль напісаў дакументальную аповесць «Нёманская казакі», дзе таксама ўпамінаецца атрадная песня.

А нарадзілася яна, паводле ўспамінаў Вячаслава Антонавіча Хілімонава, перад Першамаем 1943 года. У атрад тады паступілі звесткі, што на чарговае рабаванне насельніцтва фашысты павінны выехаць у вёскі Бурдзевічы і Унехава. Там іх трэба было «накрыць».

З пушчы партызаны выехалі адвячоркам, калі над Нёманам падымаўся густы туман. Засада прайшла ўдала: немцы не далічыліся пары дзясяткаў галаварэзаў, атрад з перамогай вярнуўся ў лес. Пра ўсё гэта ў байцоў Вячаслава Хілімонава і Міхася Карвігі склалася песня, якая стала своеасаблівым гімнам «беларускіх казакоў»:

*Туман над рекою поднялся*
*И близится солнца закат.*
*Рысью из пущи помчался*
*Особый казачий отряд...*

Пасля вайны партызаны Налібоцкай пушчы кожныя пяць гадоў збіраліся ў Карэлічах, Любчы, Ярэмічах, на партызанскай базе ў Добрачы, успаміналі свае маладосць і загінулых сяброў. Шэрагі ўдзельнікаў з кожным годам радзелі. Сёння, на вялікі жаль, гэта гераічнае пакаленне амаль сышло, але памяць пра яго сысці не павінна.

**Ірына Шатыронак,**
*г. Гродна.*

Ёсць пытанне

# Гісторыя з гісторыяй

**Першапачатковыя веды па гэтым прадмеце вучні атрымліваюць на адной мове, а працягваюць яго вывучаць на іншай. Чаму?**

**У нас усё як у многіх: наш сын хадзіў у рускамоўны дзіцячы садок (з беларускай мовай навучання недзе больш-менш паблізу мы проста не знайшлі). Потым і з той жа прычыны ён пайшоў у рускамоўную школу.**

Але ж на родную мову мы таксама ніколі не забываліся: дома чыталі казкі, легенды, паданні, знаёмілі дзіця з нашым краем, беларускай гісторыяй і музыкай. У выніку ў дзённіку сына па беларускай мове і літаратуры адзнакі толькі выдатныя!

А колькі захаплення было ў дзіцячых вачах ад прадмета "Мая Радзіма — Беларусь", які сын пачаў вывучаць у чацвёртым класе, бо вучні менавіта па-беларуску знаёміліся з гісторыяй Полацкага, Тураўскага княстваў, Вялікага Княства Літоўскага, вучыліся ствараць гістарычныя партрэты князёўны Рагнеды, Усяслава Чарадзея, Яраслава Мудрага, князя Вітаўта і іншых выдатных асоб беларускай гісторыі і культуры...

А далей мы ўжо ўяўлялі, з якой цікавасцю хлопчык возьмецца за вывучэнне гісторыі Беларусі.

Якое ж было здзіўленне, калі днямі, выпадкова зазірнуўшы ў бібліятэку сынавай школы, я ўбачыла на паліцы стос падручнікаў «История Беларуси. 6 класс». Спытала ў бібліятэкаркі: «Школьнікі што — сапраўды вывучаюць гісторыю Беларусі па-руску?»

Яна ў адказ нават здзівілася: так, маўляў, і калі з'явілася такая магчымасць, 99 працэнтаў бацькоў былі толькі «за».

Гэтыя словы потым пацвердзілі і ў адміністрацыі навучальнай установы: усё так, пераводзіць увесь клас рускамоўнай школы на вывучэнне гісторыі Беларусі па-беларуску дзеля аднаго-двух дзяцей не мае сэнсу. Апытанне бацькоў на гэты конт школа можа правесці. «Але ж вы і самі разумееце, — адказала мне намеснік дырэктара па вучэбнай рабоце, — што большасць аддасць перавагу рускай мове».

І яшчэ, як аказалася: калі з меншасцю ці адным маім сынам гісторыю Беларусі будуць індывідуальна вывучаць па-беларуску, то здаваць экзамен яму ўсё роўна прыйдзецца па-руску...

Работнікі Міністэрства адукацыі неаднаразова заяўлялі ў СМІ аб тым, што «вырашаюць, на якой мове будзе працаваць навучальная ўстанова, выканаўчыя і распарадчыя органы», і што ў адпаведнасці з заканадаўствам «рускамоўная школа можа пакінуць вывучэнне гісторыі Беларусі на беларускай мове».

Але ж для гэтага, як я разумею, мне трэба будзе шукаць аднадумцаў, такіх жа неабыякавых да спадчыны людзей, пісаць калектыўныя лісты ў розныя інстанцыі, удзельнічаць у фармальных апытаннях і да першага верасня не ведаць, на якой жа мове выдадуць падручнік.

А ўласна, чаму ў час моўнага раўнапраўя, каб забяспечыць магчымасць свайму дзіцяці атрымліваць веды па прадмеце на той мове, на якой, па сутнасці, пачыналі гэта рабіць, а потым здаваць экзамен па гісторыі роднай краіны па-беларуску, трэба збіраць вакол сябе згуртаванне бацькоў і хадзіць па кабінетах?

**М. Кузміч,**
*Мінскі раён.*

Так ці не?

# ЛЕТА БУДЗЕ КРАСНАЕ... АЛЕ СПАЧАТКУ — ВЯСНА

**Цікавы ліст даслала ў рэдакцыю настаўніца-пенсіянерка Эмілія Ю. з Дзяржыншчыны. У ім яна просіць растлумачыць, ці заўжды рускае слова «красный» трэба перадаваць праз беларускае «чырвоны». Як лічыць наша чытачка, знакамітая Страказа з байкі Крылова праспявала ўсё ж «лета краснае»... І па-беларуску — таксама, бо слова гэтае здавён бытавала ў беларускіх вёсках, сустракалася ў народных песнях. Спявалі ж «Вясна красна на дварэ».**
**А вось Генадзь Анціпенка і Ганна Новік цікавяцца, ці правільна пісаць «гэта не адказвае патрабаванням» і дзе ж усё-такі памылка: у словазлучэнні «паўтара года» ці ў «паўтары гады».**

**Як заўжды, на моўныя пытанні чытачоў адказваюць стыльрэдактары «Звязды» Алесь Саламевіч і Леў Глушыцкі.**

1. Шаноўная спадарыня Эмілія, безумоўна, мае рацыю: рускае *красный* і беларускае **красны** ў адпаведным значэнні падкрэсліваюць зусім не колер, а прыгажосць.

У «Тлумачальным слоўніку беларускай мовы» ***красны*** ў значэнні 'прыгожы' падаецца з пазнакай «нар.-паэт.» — «народна-паэтычнае слова», і яно сапраўды часта адносіцца менавіта да пораў года. Акрамя прыкладу з Якуба Коласа *(Маладая вясна, // Залатая пара! // Будзь красна і ясна, // Не шкадуй нам дабра)*, які прыводзіць названы слоўнік, можна згадаць радкі Васіля Віткі: *Яшчэ няспелае, дачаснае // Упала ніцам // І запалала лета краснае // Усё ў суніцах.*

Як відаць, слова «красны» ёсць не толькі ў народнай мове, яно сустракаецца і ў літаратуры: у перакладной — таксама. Славутыя радкі Аляксандра Пушкіна Юрка Гаўрук пераствaрыў па-беларуску так: *Ох, лета краснае! Я рад цябе любіць, // Але завошта? — пыл, ды заедзь, ды спякота.*

2. Словазлучэнне *адказваць патрабаванням* складзена памылкова, пад уплывам рускай мовы, у якой можна *отвечать* — і *на распространенные вопросы*, і *требованиям*. У нашай мове на пытанні **адказваюць**. А вось патрабаванням можна толькі **адпавядаць** (альбо не...).

Блытаніна ўзнікае і ў выпадку, калі пад уплывам рускага слова *отказать* у беларускай мове *адказваюць* у нейкай просьбе. У ёй, зазначым, можна толькі *адмаўляць*...

3. Слова **паўтара** выкарыстоўваецца з назоўнікамі мужчынскага і ніякага роду ў родным склоне. Таму пішам і кажам: **паўтара года, паўтара кіламетра, паўтара вядра** і гэтак далей. З назоўнікамі жаночага роду выкарыстоўваецца слова паўтары (склон застаецца той самы): **паўтары хвіліны, паўтары старонкі, паўтары талеркі.**

Такім чынам, казаць і пісаць **паўтары гады** і да т. п., вядома ж, няправільна.

Смех смехам...

# СІЛА ЁСЦЬ. І РОЗУМ ТРЭБА

**На работу і з работы я заўсёды хадзіў пешшу, а вось маршруты стараўся выбіраць розныя. Часам, здаралася, нават небяспечныя.**

Дык вось, гады са два таму вяртаюся я дадому. Пераходжу чыгунку, іду па досыць вузкім «калідоры», які ўтвараўся паміж штабялямі бетонных шпал, і наперадзе бачу пару — ён і яна... Падобна, высвятляюць адносіны? Я там зусім недарэчы, але ж іду...

— Дзядзька, — раптам спыняе мужчына, — калі я цябе стукну, ты ўпадзеш ці не?

Правяраць гэта мне, вядома ж, не хочацца, тым больш што хлопец выглядае як сапраўдны баксёр. Таму на пытанне я адказваю пытаннем:

— А навошта мяне стукаць?

«Баксёр» бянтэжыцца: відаць, шукае падставу для бойкі і такі знаходзіць.

— А як ты ставішся да цыганоў? — пытае ў мяне.

Цяпер бянтэжуся я: здавалася б, можна сказаць, што добра... А раптам ён — дрэнна? Стукне ж, як піць даць!

— Я не меў з цыганамі спраў, — ухіляюся ад адказу яшчэ раз.

І тым самым зноў заганяю «баксёра» ў кут: ён не можа прыдумаць, да чаго б «прыкалупацца», стрvärlden свaю ваяўнічасць... Разгублена расказвае пра сваё жыццё і няўдалую жаніцьбу, пра жонку (яна ў гэты час плача побач), якую даводзіцца «выхоўваць».

Карацей, развіталіся мы амаль сябрамі. Я нават папрасіў маладзёна, каб, крый божа, не падымаў руку на сваю палавіну, але ён мне гэтага не абяцаў.

**Яўген Шастакоў,**
*г. Гомель*

**Пошту чытала Валянціна ДОЎНАР.**

Небяспечная рамантыка

# АРАМАТЫЧНЫЯ СВЕЧКІ МОГУЦЬ НАШКОДЗІЦЬ ЗДАРОЎЮ

**Араматычныя свечкі ствараюць настрой (як абысціся без іх у такое рамантычнае свята, як Дзень святога Валянціна?), знімаюць стомленасць, ахінаюць букетам водараў — і вылучаюць шкодныя хімічныя рэчывы. Спецыялісты сцвярджаюць: дыхаць араматызаванымі парамі ўвесь вечар не менш шкодна, чым цягам некалькіх гадзін быць пасіўным курыльшчыкам. Што ж рабіць? Прытрымлівацца правілаў бяспекі.**

Свечкі бываюць васковыя (натуральныя, зробленыя з пчалінага ці соевага воску) і парафінавыя (іх атрымліваюць з нафты і сланцу). У парафінавыя часта дадаюць араматызатары і фарбавальнікі.

— Парафін падчас гарэння вылучае ў паветра бензол і талуол — шкодныя для жывога арганізма канцэрагены. Бензол валодае мутагенным, алергенным, эмбрыятаксічным дзеяннем, што вельмі небяспечна для цяжарных, — расказвае **ўрач-лабарант Мінскага абласнога цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Святлана КЛІМУК**. — Талуол — яд, які выклікае вострыя і хранічныя атручэнні. Яго раздражняльны эфект выражаны больш, чым у бензолу. Ён выклікае эндакрынныя парушэнні і зніжае працаздольнасць. А доўгі кантакт з малымі дозамі талуолу можа шкодна ўплываць на кроў. З прычыны высокай растваральнасці ў ліпідах і тлушчах талуол назапашваецца пераважна ў клетках цэнтральнай нервовай сістэмы.



А каб водар трымаўся даўжэй, многія вытворцы выкарыстоўваюць яшчэ адно шкоднае хімічнае спалучэнне — дыэтылфталат. Яно можа выклікаць алергічныя рэакцыі і экзэму, галавакружэнне, галаўны боль, парушэнне рытму дыхання, слёзацячэнне, млоснасць. А пры рэгулярным уздзеянні пашкоджвае нервовую і дыхальную сістэмы, унутраныя органы і элементы крыві, садзейнічае ўтварэнню злаякасных пухлін. Майце на ўвазе, што нават калі свечка араматызаваная натуральнымі эфірнымі алеямі, араматызатар прагарае, мяняецца яго хімічная структура і скажаецца водар. Таму злоўжываць нават натуральнымі араматычнымі свечкамі не трэба.

Нячастае карыстанне парафінавымі свечкамі, канешне, не прынясе вялікай шкоды вашаму арганізму. А вось сістэматычнае іх выкарыстанне ўплывае негатыўна.

Васковыя ж свечкі цалкам выраблены з натуральных рэчываў, яны не прычыняць шкоды здароўю, нават калі вы адначасова запаліце іх вялікую колькасць. Іх можна выкарыстоўваць для стварэння рамантычнай абстаноўкі, зняцця стрэсу, у халодны перыяд. Сёння папулярнасць набірае і соевы воск. Ён цалкам бяспечны, таннейшы за пчаліны і не ўтрымлівае хімічных рэчываў.

**Каб не нанесці шкоды здароўю пры выкарыстанні свечак, варта прытрымлівацца наступных правілаў:**

✓ Набывайце араматычныя свечкі з прыроднага воску — пчалінага ці соевага, з натуральнымі араматызатарамі.

✓ Запальвайце іх не часцей як 2—3 разы на тыдзень і ў памяшканні, якое добра праветрываецца.

✓ Не пакідайце запаленыя свечкі без нагляду, тым больш на ноч.

✓ Набывайце іх варта ў спецыялізаваных крамах, дзе ёсць дакументы, якія сведчаць пра бяспеку і якасць.

Далікатная тэма

# Не згубіць ні кроплі!

## Што трэба ведаць пры нетрыманні

**Пра гэту далікатную праблему не прынята гаварыць адкрыта. Але ад нетрымання мачы пакутуе нямала жанчын і мужчын рознага ўзросту. Між іншым, большасці з іх можна і трэба дапамагчы. Як гэта зрабіць, расказала ўрач вышэйшай катэгорыі, загадчык уралагічнага аддзялення медыцынскага цэнтра «Ладэ» Вольга АНТОНАВА.**



### Цяжар — не для жанчын!

— Перш чым перайсці да дарослых, некалькі слоў скажу пра дзяцей. У іх энурэз развіваецца пераважна на нервовай глебе. Як правіла, гэта начное нетрыманне мачы, але здараецца і дзённае. Часцей за ўсё гэта неўралагічна абумоўленая хвароба, калі ў галаўным мозгу не фарміруецца адпаведны рэфлекс. І тут адыгрывае ролю спадчынная схільнасць. Таксама садзейнічае раздражненне нервовай сістэмы — з розных прычын. Напрыклад, неспрыяльная абстаноўка дома: шмат стрэсавых сітуацый, нелады паміж бацькамі. Або празмернае карыстанне смартфонам, захапленне камп'ютарнымі гульнямі ці мультфільмамі. Энурэз сумесна лечаць неўролаг і ўролаг. Уролаг павінен выключыць анатамічныя дэфекты, прыроджаныя анамаліі, інфекцыю. Неўролаг лечыць гіперактыўнасць, працуе над фарміраваннем правільнага рэфлексу галаўнога мозгу на мочаспусканне. З гэтай праблемай спраўляюцца эфектыўна, і ніхто на ўсё жыццё не застаецца з нетрыманнем.

***— Але ў пажылым узросце праблема таксама існуе. У чым прычыны?***

— Што датычыцца дарослых, то на 85—90 % гэта жаночая праблема. У сярэднім пасля 50 гадоў у жанчын актывізуюцца працэсы старэння. У прыватнасці, падае ўзровень жаночых палавых гармонаў — эстрагенаў, з-за чаго станчаецца слізістая, у тым ліку і ў органах мочаспускання — урэтры і мачавым пухіры. З узростам слабеюць і мышцы — з розных прычын: цяжкія роды з разрывамі ў анамнезе, падняцце цяжараў, калі на рабоце прыходзілася падымаць цяжкія прадметы, гэтыя праблемы сустракаюцца ў поварах, прадаўцоў і інш. Такія фактары, як цяжкая фізічная праца, спадчынная схільнасць, плюс цяжкія роды і старэнне слізістай прыводзяць да таго, што сфінктар — мышца, якая ўтрымлівае мачу, — пачынае яе прапускаць. Спачатку гэта адбываецца пры напружанні: падчас чхання, кашлю, падняцця цяжару ці падчас скачкоў, напрыклад, на батуце — пры ўсім, што вядзе да павышэння ўнутрыбрушного ціску. У далейшым гэта адбываецца ўжо без усялякага напружання, пасля таго, як жанчына ўстае з ложка, напрыклад. І гэта прычына, па якой хтосьці адразу, хтосьці не зусім, але прыходзіць да ўрача, каб вырашыць гэту праблему.

***— Чым можна дапамагчы ў такой сітуацыі?***

— Першае і самае простае — перагледзець лад жыцця: я прашу пацыентак не паднімаць цяжар. Па-другое, звярнуцца да гінеколага-эндакрынолага, каб ён прызначыў гармоназамяшчальную тэрапію, якая дапаможа аднавіць слізістую, з-за чаго ўтрыманне мачы палепшыцца. Трэцяе — трэніраваць мышцы тазавага дна. Гэтыя практыкаванні можна выконваць у хатніх умовах, яны абсалютна простыя, урачы звычайна выдаюць памяткі з імі. Чацвёртае — практыкаванні з вагінальнымі конусамі. Гэта спецыяльны трэнажор, які трэніруе мышцы. Конусы градзіруюцца па вазе — ад лёгкага да самага цяжкага. За чатыры месяцы можна цалкам эфектыўна аднавіць усе мышцы, якія ўтрымліваюць мачу.

***— Гэта ўдасца ў любым узросце?***

— Абсалютна. У кожнай жанчыны, дарэчы, узрост пачатку гэтых праблем індывідуальны. Многае залежыць ад колькасці родаў, ад характару працы. У некаторых жанчын першапачаткова высокі ўзровень эстрагенаў, і падаць ён пачынае плаўна к 60 гадам. У іншых эстрагенаў няшмат, і зніжэнне пачынаецца ў 45. Але ў любым узросце можна дапамагчы. У 80 % выпадкаў ад пералічаных мной мер будзе значнае паляпшэнне. Існуе і медыкаментознае лячэнне нетрымання мачы, якое праводзіцца ў комплексе з практыкаваннямі і экстрагеназамяшчальнай тэрапіяй. Часцей за ўсё выкарыстоўваюцца М-халінаблакатары. Гэта група прэпаратаў, якія ўздзейнічаюць на нервовыя канчаткі ў вобласці сфінктара мачавога пухіра.

Калі ж такіх мер недастаткова, можна прапанаваць наступную ступень вырашэння праблемы. Гэта так званая эстэтычная гінекалогія. У пэўных кропкі ўводзяцца гіалуронавыя філеры — прэпараты гіалуронавай кіслаты, што дазваляе ўтрымліваць сфінктар мачавога пухіра, звужае урэтру і дапамагае ўтрымліваць мачу. Такія працэдуры выконваюцца на мяжы двух навук — гінеколагамі і ўролагамі, але пакуль гэтых спецыялістаў у нашай краіне няшмат.

### Ці дапаможа аперацыя?

***— Якія яшчэ новыя методыкі прымяняюцца?***

— Вельмі эфектыўнае лазернае амалоджванне як похвы, так і мочапалавых шляхоў. Гэта небалючая працэдура, патрабуецца ад 1 да 4 сеансаў. Дзякуючы ўздзеянню лазера патаўшчаецца слізістая, актывізуецца яе кровазабеспячэнне. Паляпшаецца не толькі мочаспусканне, а і якасць палавога жыцця. Такая інавацыйная методыка ў любым узросце прымальная, бяспечная і эфектыўная. На мой погляд, гэта добрая перспектыва, няхай камусьці яе давядзецца паўтараць раз у год.

І апошняя лінія абароны ў лячэнні нетрымання мачы — аператыўнае ўмяшанне. У свеце цяпер шырока прымяняецца пастаноўка імплантаў. Гэта спецыяльныя сінтэтычныя сетачкі, якія ўстанаўліваюцца пад скуру ў адпаведныя кропкі і, як гамак, утрымліваюць сфінктар мачавога пухіра, выконваючы яго функцыю. Гэта аперацыя вядома як TVT-пластыка, можа быць і пад іншай назвай. Імплант ставіцца на ўсё жыццё, ён на 100 працэнтаў эфектыўна спраўляецца са сваёй задачай. Такія імпланты ўжываюцца і пры пралапсе (правісанні) геніталій, пры выпадзенні маткі, похвы. У такім выпадку мадэлюецца ўсё тазавае дно, а не толькі сфінктар мачавога пухіра.

Абагульняючы, трэба сказаць, што абавязкова варта звяртацца да ўрача. У 100 % выпадкаў падыходзячы метад лячэння будзе падабраны, пачынаючы ад самага простага да радыкальнага. На любым этапе, пры любой ступені запушчанасці медыцына можа дапамагчы. Тым больш, што навука зрабіла ў гэтым плане вялікія крокі наперад.

### Мужчыны таксама пакутуюць

***— З якіх прычын узнікае нетрыманне мачы ў мужчын?***

— Тут дзве катэгорыі самых распаўсюджаных праблем. Першая датычыцца мужчын у любым узросце пры неўралагічных, нейрагенных праблемах з мачавым пухіром. Яны ўзнікаюць пасля інсультаў, траўмаў спіннога і галаўнога мозга, калі парушаны цэнтры ўтрымання мачы. Гэтай групай пацыентаў займаюцца неўролагі. Ёсць прэпараты, якія паляпшаюць нервовую праводнасць, але тут важнае і лячэнне асноўнага захворвання. Другая група — гэта ўзроставыя пацыенты з вялікімі адэномамі прастаты. Адэнома — дабраякасная пухліна, якая вядзе да парушэння мочаспускання. Часам яна разрастаецца і цалкам ці на 90 % перакрывае мочаспускальны канал. Мачавы пухір перапоўнены, а позыву пацыент не адчувае. Мача па кроплі выцякае па ўрэтры. Гэта з'ява называецца парадаксальная ішурыя або нетрыманне мачы пры поўнай хранічнай затрымцы. Яе можна назіраць у пацыентаў, якія доўгі час не абследуюцца і не лечацца. Але з праблемай нетрымання мужчыны сутыкаюцца нашмат радзей, чым жанчыны.

***— Што рабіць жанчынам, каб у сталым узросце гэтых праблем не было?***

— Выконваць комплекс практыкаванняў па Кегелю для ўмацавання мышц тазавага дна, яны маюцца ў інтэрнэт-крыніцах. Не паднімаць больш за сем кілаграмаў: цяжар не для жанчын. У пачатку клімаксу, у так званай прэменапаўзе, калі з'яўляюцца першыя змены менструальнага цыклу, звяртацца да гінеколага, каб падобжыць маладосць. Прызначаюцца раслінныя, гармоназамяшчальныя прэпараты, якія аднаўляюць узровень уласных эстрагенаў. Важная і прафілактыка цыстытаў як хранічнай праблемы. Калі цыстыт часты, гэта можа сведчыць аб наяўнасці бактэрый у мачы, што ўзмацняе нетрыманне мачы любой этыялогіі. Каб не было цыстытаў, варта падтрымліваць у норме мікрафлору похвы, не дапускаць дысбактэрыёзу, малочніцы, не пераахалоджвацца, выконваць меры постаітальнай прафілактыкі, ужываць прэпараты на аснове журавін. Гэта прыродны антысептык, які ўтрымлівае бензольную кіслату, а яна знішчае ўсе бактэрыі ў мачы. Журавіны карысныя і ў выглядзе морсу, і ў выглядзе капсул з журавінавым экстрактам. А мужчынам параю своечасова лячыць адэному прастаты і перыядычна наведваць уролага.

Матэрыялы падрыхтавала
Алена КРАВЕЦ.

Міншчына ўнікальная

# СПАДЧЫНА ПРАЗ ІНТЭРНЭТ

**У Слуцкім цэнтры дзіцячай творчасці навучэнцаў заўсёды выхоўвалі на прыкладах традыцыйнай народнай культуры, пачуцці любові да свайго краю. У Год малой радзімы гэтая работа набыла новае гучанне.**

— Дзеці выязджаюць у мясціны, дзе жывуць іх бабулі, дзядулі, дзе нарадзіліся іх бацькі. На ўроках выяўленчага мастацтва яны малююць хаты, падворкі, вуліцы, пейзажы, дарагія сэрцу іх блізкіх. На практыцы спасцігаюць хараство беларускай прыроды, прыгажосць душы сваіх продкаў, іх традыцыі і побыт, унікальнасць, самабытнасць кожнага кутка Беларусі. Свае работы выхаванцы дэманструюць на міні-выстаўках, — адзначае дырэктар цэнтра Вольга Ярашэвіч.



Такая замалёўка з вясковага жыцця вобразна расказвае пра малую Радзіму.

У межах летняга аздараўлення быў запушчаны праект «Магія кодаў», за які атрымалі дыплом першай ступені на рэспубліканскім конкурсе. Сутнасць яго ў тым, што дзеці спазнаюць сваю краіну шляхам выкарыстання QR-кодаў. Асаблівая ўвага — вывучэнню культурных традыцый, гісторыі Случчыны.

— У межах праекта будзем знаёміць дзяцей з культурнай спадчынай Слуцка, вучонымі, знакамітымі людзьмі, пачэснымі землякамі, — кажа метадыст цэнтра Вольга Шэйко.

Праект стартаваў у мінулым годзе і працягнецца да 2020-га. Ён прадугледжвае самыя разнастайныя мерапрыемствы: мастацкія, творчыя, забаўляльныя, віктарыны, конкурсы. Сучасныя дзеці амаль з пялёнак валодаюць інтэрнэтам. Таму педагогі імкнуцца накіраваць іх інтарэс у патрэбным кірунку пры дапамозе найноўшых інфармацыйных тэхналогій, паколькі звычайныя формы навучання не маюць такога эфекту. Напрыклад, правялі QR-віктарыну «Традыцыйныя абрадавыя стравы беларусаў». З дапамогай кодаў дзеці вывучалі назвы нацыянальных страў, іх рэцэптуру. Адкрыццём для іх сталі і верашчака, і дзеруны.



Заняткі з юнымі мастакамі праводзіць педагог Алена ЧЫЖЫК.

А падчас мерапрыемства «Вясны партрэт княгіні Случчыны» выхаванцы пазнаёміліся з вядомымі гістарычнымі асобамі — Анастасіяй Слуцкай і Сафіяй Слуцкай. Фільм з дакументальнымі сведчаннямі аб заступніцах зямлі Слуцкай вельмі ўсіх уразіў. Віктарына праходзіла ў інтэрактыўнай форме. Гістарычная шоу-прэзентацыя абрадавага свята Пакровы зноў жа адбылася з выкарыстаннем сучасных тэхналогій.

Праект працягваецца, наперадзе шмат цікавага і пазнавальнага.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**
**Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.**

# МАЙСТЭРНЯ СЯРОД КНІГ

## Аўтарская лялька захапіла чытачоў гродзенскай бібліятэкі

**Творчы патэнцыял сваіх чытачоў раскрыла загадчыца бібліятэкі-філіяла № 3 Гродна Іна Сотнікава. Яна скончыла курсы па вырабе аўтарскай лялькі і вырашыла знайсці аматараў сярод сваіх чытачоў. І гэта ўдалося. Так на базе бібліятэкі пачаў дзейнічаць клуб «Гарадзенская лялька», якому сёлета споўнілася пяць гадоў.**



### Пляцоўка для хобі

Сюды можа прыйсці кожны, хто хоча тварыць. Аматары лялькі ўпэўнены: калі чалавек не ўмее, але вельмі жадае, у яго ўсё атрымаецца. Можа, не шэдэўр, але гэта будзе твор. Варта толькі ўзяць у рукі палімерную гліну. Зараз аматарскі клуб «Гарадзенская лялька» аб'ядноўвае больш за 30 жанчын.

— Бібліятэка — гэта не толькі месца, дзе захоўваюцца кнігі, яна можа быць і культурным цэнтрам, творчай пляцоўкай, куды прыходзяць гараджане, каб карысна і цікава правесці свой вольны час, — разважае Іна Сотнікава.

У бібліятэцы-філіяле № 3 Гродна працуе не толькі клуб. Тут створаны адзіны ў Гродне музей аўтарскай лялькі. Перш чым расказаць аб экспанатах, загадчыца бібліятэкі робіць экскурс у тэхналогію. Аказваецца, у кожнага майстра ёсць свае нюансы.

— Тут прадстаўлены лялькі з палімернай гліны, якія робяцца ўручную. Твар, рукі, ногі лепяцца і замацоўваюцца на провалачным каркасе, тулава робіцца з сінтэпону альбо іншых тканін, — расказвае суразмоўніца. — Я, напрыклад, у адрозненні ад іншых, запякаю адразу не ўвесь выраб, а па частках, а потым замацоўваю кожную дэталь на каркасе. Пасля гэтага ствараецца вобраз, малюецца твар, робяцца валасы, адзенне, аксесуары. Працэс няхуткі. Некаторым здаецца, што ты нешта зляпіў, адзеў з таго, што ёсць — і лялька гатова. А да кожнага вобраза падбіраецца адпаведнае адзенне: гэта і карунікі, і лён, і шоўк, і стужкі, гузікі... З некаторымі лялькамі можна і некалькі месяцаў праваждацца.

Арганізатары лічаць важным прыцягнуць сюды тых, хто адчувае ў сабе творчы патэнцыял, але не ведае, дзе яго можна рэалізаваць. Тут гатовы падтрымаць навічкоў.

— У нас даверальныя адносіны, мы дзеля гэтага і збіраемся, каб дзяліцца, — кажа член клуба Ірына Вараб'ёва.

**У тэму**

**Музей лялькі створаны на базе Індурскага цэнтра культуры Гродзенскага раёна, дзе ўжо некалькі гадоў ладзяць брэндавае свята. У лялечнай экспазіцыі прадстаўлены экспанаты рознага прызначэння, тэхнікі і тэрміну выканання, а ў стварэнні музея маглі прыняць удзел усе, хто пажадаў. Сабрана каля 300 экспанатаў.**

### Гран-пры ў конкурсе Максіма Багдановіча

У музеі сабрана больш за сотню ўнікальных экспанатаў, якія зроблены рукамі чытачоў-аматараў. Звяртае на сябе ўвагу дзяўчынааленьна з вельмі галінастымі рагамі. Аказваецца, такім аўтар гэтай работы ўбачыла сімвал Гродна — аленя святога Губерта. Жывёла, па задумцы майстра, ператварылася ў прыгожую дзяўчыну, якая выступае ахоўніцай старажытнага горада.

З казкі «Аліса ў краіне цудаў» сышоў да нас сімпатычны Капялюшнік. У вобразе прадуманы ўсе дэталі — скураныя боты, капялюш, шаравары. Усё хоць і мініяцюрнае, але вельмі падобнае.

Вось знакаміты і непаўторны Чарлі Чаплін — яго выканала былая медсястра, якая нядаўна стала членам клуба.

— Летась мы рабілі кампазіцыю пра Максіма Багдановіча і ўзялі Гран-пры на абласным фестывалі кнігі. Атрымалі куфар для пікніка. Пакуль мы прыстасавалі яго пад падстаўку для нашага лялечнага доміка, а летам, думаю, ён нам спатрэбіцца: будзем выбірацца на прыроду з членамі нашага клуба, — будуе планы Іна Сотнікава.

Безумоўна, адным з яскравых экспанатаў музея можна назваць персанажа вядомага фільма «Аватар».

— Некаторыя робяць тэдзі-мішак з тэкстылю, — расказвае Іна Сотнікава. — Іх асаблівасць — дыскавае замацаванне, што дазваляе рухацца галаве і рукам. Тут свае тэхналогіі ў набіўцы, гэта, як правіла, пілавінне. Працэс вырабу працаёмкі, і каштуюць яны нямала. У нас кошт невысокі — 30—40 рублёў, некаторыя майстры прадаюць за 70—80 рублёў.

Аматарскі клуб не ставіць мэтай зарабляць грошы. Членскія ўнёскі і майстар-класы патрабуюць мінімальных затрат. Музейныя зборы таксама невялікія — ад 50 капеек да 1 рубля. Між тым клуб арганізуе дабрачынныя выстаўкі, збор сродкаў ідзе ў тым ліку для дапамогі бяздомным жывёлам.

### Лялькі прыцягваюць

Нядаўна клуб атрымаў заказ выканаць сямейную пару ва ўтульнай абстаноўцы. Іна з Ірынай прадставілі гаспадароў у рэспектабельным выглядзе. Ён — у фраку, капелюшы і пенснэ, яна — у доўгай сукенцы і капелюшы з вэлюмам. Абое сядзяць у пакоі, дзе распалены камін. Аўтары не тояць, што ім прыемна было займацца гэтай работай, хоць далёка не ўсё ішло гладка. Тое, што атрымалася, задаволіла гаспадароў.

— Па-першае, гэта эксклюзіў. І калі ты робіш нейкі вобраз, ты пра яго думаеш, выношваеш, укладваеш нешта і са свайго характару і сваіх уяўленняў аб прыгажосці, — упэўнена Ірына Вараб'ёва.

Становяцца папулярнымі выстаўкі лялек. Ірына Вараб'ёва расказала, што не так даўно пабывала ў Чэхіі і выпадкова трапіла на такую выстаўку ў Празе. Там аказалася прадстаўніца Беларусі са сваімі работамі, што вельмі ўзрадавала гродзенку. Міжнародныя выстаўкі праходзяць і ў нашай краіне. Лялька на працягу стагоддзяў не страчвае сваёй магічнай сілы і па-ранейшаму прыцягвае да сябе.









**Маргарыта УШКЕВІЧ.**
**Фота аўтара.**

## ОБЪЯВЛЕНИЕ О ТОРГАХ
## по продаже имущества унитарного производственного предприятия «Эвилам»

| | |
|---|---|
| Дата, время, место и форма проведения торгов, предмет торгов, его местонахождение, начальная цена, порядок ознакомления, информация о земельном участке | 25.02.2019 в 11.00 назначены торги в форме аукциона по адресу: г. Витебск, ул. «Правды», 48, пом. 18 по продаже:<br>Лот № 1. Изолированное помещение с инвентарным номером 200/D-184039, наименование – «Производственное помещение», общей площадью 1582,8 кв. м, расположенное по адресу: Витебская область, г. Витебск, пр-т Фрунзе, 81/20-20 стоимостью 42840,00 рублей с НДС;<br>Лот № 2. Изолированное помещение с инвентарным номером 200/D-184036, наименование – «Производственное помещение», общей площадью 4961,2 кв. м, расположенное по адресу: Витебская область, г. Витебск, пр-т Фрунзе, 81/20-17 стоимостью 120540,00 рублей с НДС;<br>Лот № 3. Изолированное помещение с инвентарным номером 200/D-122412, наименование – «Корпус 25А, административное помещение», общей площадью 101,8 кв. м, расположенное по адресу: Витебская область, г. Витебск, пр-т Фрунзе, 81/19-13 стоимостью 3660,00 рублей с НДС;<br>Лот № 4. Изолированное помещение с инвентарным номером 200/D-122413, наименование – «Корпус 25А, административное помещение», общей площадью 156,8 кв. м, расположенное по адресу: Витебская область, г. Витебск, пр-т Фрунзе, 81/19-15 стоимостью 5580,00 рублей с НДС;<br>Лот № 5. Изолированное помещение с инвентарным номером 200/D-122411, наименование – «Корпус 25А, административное помещение», общей площадью 374 кв. м, расположенное по адресу: Витебская область, г. Витебск, пр-т Фрунзе, д. 81, корп. 19-12 стоимостью 12360,00 рублей с НДС;<br>Лот № 6. Изолированное помещение с инвентарным номером 200/D-122409, наименование – «Корпус 25А, административное помещение», общей площадью 610,5 кв. м, расположенное по адресу: Витебская область, г. Витебск, пр-т Фрунзе, 81/19-8 стоимостью 18840,00 рублей с НДС;<br>Лот № 7. Пресс кривошипный КД2128Е, инвентарный номер 20309, стоимостью 1622,78 рубля с НДС;<br>Лот № 8. Пресс кривошипный КД2126, инвентарный номер 21184, стоимостью 1278,66 рубля с НДС;<br>Лот № 9. Пресс кривошипный КД2126, инвентарный номер 21330, стоимостью 1278,66 рубля с НДС;<br>Лот № 10. Пресс кривошипный КД2326, инвентарный номер 936, стоимостью 1469,44 рубля с НДС;<br>Лот № 11. Пресс кривошипный КД2124Е, инвентарный номер 20268, стоимостью 1050,94 рубля с НДС;<br>Лот № 12. Пресс кривошипный КД2324, инвентарный номер 1611, стоимостью 1622,78 рубля с НДС;<br>Лот № 13. Пресс кривошипный КД2324, инвентарный номер 1832, стоимостью 1054,43 рубля с НДС;<br>Лот № 14. Пресс кривошипный КД2322, инвентарный номер 1604, стоимостью 888,00 рубля с НДС.<br>Информация о земельном участке для обслуживания продаваемого недвижимого имущества отсутствует. Торги по недвижимости (первые повторные торги) и прессам (вторые повторные торги) проводятся повторно.<br>Лоты можно осмотреть, предварительно связавшись с ликвидатором по тел. 8 029 7118733 |
| Шаг аукциона | 5 % от начальной цены предмета торгов |
| Сведения о продавце и организаторе торгов, контактные телефоны | Унитарное предприятие «Эвилам», 210101, г. Витебск, проспект Фрунзе, 81/19. УНП 300203528, тел./факс: 80212557253.<br>Организатор – ИП Железовский Юрий Александрович, г. Витебск, ул. «Правды», 48, оф. 18, тел. +375 29 7118733 |
| Размер, порядок и сроки внесения суммы задатка, банковские реквизиты для его зачисления | Задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (лота) должен быть зачислен в срок до 22.02.2019 включительно на счет унитарного предприятия «Эвилам» № BY04BLBB30120300203528001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Витебской области, БИК BLBBBY2X, УНП 300203528. Участнику, не выигравшему торги, задаток возвращается |
| Место, дата, время начала и окончания приема заявлений на участие в торгах и прилагаемых к ним документов | г. Витебск, ул. «Правды», 48, пом. 18.<br>Дата и время начала приема заявлений – 18.02.2019 в 11.00.<br>Дата и время окончания приема заявлений – 22.02.2019 в 17.00.<br>К заявлению прилагаются:<br>1. Документ, подтверждающий внесение суммы задатка;<br>2. Для резидентов – копия устава, свидетельство о государственной регистрации, доверенность для представителя юридического лица, документ, подтверждающий полномочия руководителя юридического лица;<br>3. Нерезидентам – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до даты подачи заявления) с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык;<br>4. ИП резидент – копия свидетельства о государственной регистрации и подлинник;<br>5. ИП нерезидент – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык;<br>6. Представителем гражданина Республики Беларусь, индивидуального предпринимателя – резидента Республики Беларусь – нотариально удостоверенная доверенность;<br>7. Представителем иностранного физического лица, ИП – нерезидента Республики Беларусь – легализованная в установленном порядке доверенность с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.<br>При подаче документов на участие в торгах физическое лицо, ИП, представитель физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица, иной организации предъявляют оригинал документа, удостоверяющего личность, и представителя его копию |
| Информация о необходимости возмещения участником, выигравшим торги, затрат на организацию и проведение торгов | Участник, выигравший торги, возмещает затраты на организацию и проведение торгов: на оценку прессов в размере 357,92 рубля, на оценку недвижимости в размере 1996,52 рубля и на объявление в размере 412,80 рубля |
| Порядок оформления участия в торгах | К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в указанный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов, зарегистрированное в журнале регистрации заявлений на участие в торгах, и заключившие с организатором торгов договор о задатке |
| Порядок оформления результатов торгов | В день проведения торгов участник, выигравший торги, и все присутствующие члены комиссии подписывают протокол о результатах торгов в двух экземплярах, который утверждается организатором торгов в день их проведения. После предъявления копий документов, подтверждающих возмещение затрат на организацию и проведение торгов, в установленном порядке в соответствии с условиями торгов между продавцом и участником, выигравшим торги, либо единственным участником конкурса, либо единственным участником аукциона заключается договор купли-продажи в трехдневный срок |
| Срок оплаты приобретенного предмета торгов | 7 календарный дней с даты подписания договора купли-продажи предмета торгов |
| Дополнительная информация | В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 процентов, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона.<br>Объявление о проведении вторых повторных торгов по продаже прессов и первых повторных торгов по продаже недвижимости было опубликовано в газете «Звязда» за 29.01.2019, первых повторных торгов по продаже прессов и первых торгов по продаже недвижимости было опубликовано в газете «Звязда» от 22.12.2018, а первых торгов по продаже прессов – в газете «Звязда» от 16.10.2018 |

Антикризисный управляющий сообщает о переносе даты проведения открытых торгов в форме аукциона по продаже дебиторской задолженности ООО «Фабинтек-сервис» (дата торгов: 26.02.2019 в 11.00), дебиторской задолженности и имущества ООО «Сфера-СК» (дата торгов: 26.02.2019 в 11.30), имущества ООО «Кров-СК» (дата торгов: 01.03.2019 в 10.00), имущества частного предприятия «ФОНДО» (дата торгов: 26.02.2018 в 09.00). УНП 191720323

В связи с поступившим заявлением о признании безвестно отсутствующей суд Ошмянского района Гродненской области просит граждан и юридических лиц в течение двух месяцев со дня публикации сообщить суду ( гор. Ошмяны, улица Советская, дом. 39) об известных им сведениях в отношении Богданович Жанны Степановны 16.04.1990 года рождения, уроженки г. Ошмяны Гродненской области, зарегистрированной по адресу: пер. Больничный, д. 2, кв. 4.

### ООО «Юридическая компания Аспект»
### проводит повторные ТОРГИ в форме открытого аукциона по продаже недвижимого имущества Торгово-производственного частного унитарного предприятия «НАСТУРЦИЯ», находящегося в процедуре ликвидации

| № лота | Наименование лота | Начальная цена за лот с НДС 20 %, руб. | Шаг торгов (5 %), руб. | Задаток для участия в торгах (10 %), руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | **Объект № 1.** «Здание магазина» – капитальное строение с инвентарным номером 500/С-18169, расположенное по адресу: г. Минск, переулок Козлова, 5, на земельном участке с кадастровым № 500000000001001264 площадью 0,2278 га, выделенном в постоянное пользование. Назначение объекта: «Здание специализированное розничной торговли». Общая площадь объекта 1447,4 кв. м.<br>**Объект № 2.** «Здание склада» – капитальное строение с инвентарным номером 500/С-31634, расположенного по адресу: 220037, г. Минск, переулок Козлова, 5/1, на земельном участке с кадастровым № 500000000001001264 площадью 0,2278 га, выделенном в постоянное пользование. Назначение объекта: «Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ». Общая площадь объекта 150,0 кв. м | 1 100 000,00 | 55 000,00 | 110 000,00 |

*Торги состоятся **28.02.2019 г. в 10.00** по адресу **г. Минск, ул. Тимирязева, д. 65, оф. 401, каб. 1**. Срок приема заявок, внесения задатка для участия в торгах – до **26.02.2019 г.** включительно. Заявки принимаются организатором по месту проведения торгов*

Предыдущие объявления о торгах опубликованы в газете «Звязда» за 26.10.2018 г., 11.12.2018 г., 16.01.2019 г.

### ООО «Юридическая компания Аспект»
### проводит повторные ТОРГИ в форме открытого аукциона по продаже движимого имущества Торгово-производственного частного унитарного предприятия «НАСТУРЦИЯ», находящегося в процедуре ликвидации

| № лота | Наименование лота | Начальная цена за лот с НДС 20 %, руб. | Шаг торгов (5 %), руб. | Задаток для участия в торгах (10 %), руб. |
|---|---|---|---|---|
| Имущество в ассортименте, новое и бывшее в употреблении (кухонная и офисная мебель, мебельная фурнитура, товары для дома, оргтехника и другое) согласно перечню, размещенному на сайте **www.nasturcia.by** | | Согласно данным сайта **www.nasturcia.by.** Раздел «Акции» – «Распродажа имущества розничного предприятия» – «перечень имущества для аукциона» | | |

*Торги состоятся **28.02.2019 г. в 14.00** по адресу **г. Минск, ул. Тимирязева, д. 65, оф. 401, каб. 1**. Срок приема заявок, внесения задатка для участия в торгах – до **26.02.2019 г.** включительно. Заявки принимаются организатором по месту проведения торгов*

Предыдущее объявление о торгах опубликовано в газете «Звязда» за 10.11.2018 г.

| | |
|---|---|
| Продавец | **Торгово-производственное частное унитарное предприятие «НАСТУРЦИЯ»** |
| Организатор торгов | **ООО «Юридическая компания Аспект»** |
| Реквизиты для оплаты задатка | **Бенефициар – Торгово-производственное частное унитарное предприятие «НАСТУРЦИЯ», р/с BY61 BPSB 3012 1009 5001 8933 0000, ОАО «БПС-Сбербанк», ул. Уральская, 1А, Минск BIC: BPSBBY2X, УНП 100491810** |

Условия торгов

К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в установленный срок заявление с приложением всех необходимых документов, зарегистрированное в журнале регистрации заявлений на участие в торгах, и заключившие с организатором торгов договор о задатке;
лицо, желающее участвовать в торгах, представляет с заявлением оригинал платежного документа с отметкой банка о его исполнении, подтверждающего внесение на текущий (расчетный) счет ПРОДАВЦА, указанный в настоящем извещении, суммы задатка (задатков). При личном обращении заявитель (представитель) предъявляет оригинал документа, удостоверяющего личность. Дополнительно организатору торгов представляются:
– юридическом лицом: копия последней редакции устава и свидетельства о государственной регистрации вместе с их подлинниками для заверения копий организатором аукциона, доверенность на представителя или документ, подтверждающий полномочия руководителя юридического лица; юридическим лицом, иной организацией (нерезидентом РБ): копии учредительных документов вместе с выпиской из торгового реестра страны их учреждения (выданной не ранее шести месяцев до даты подачи заявления) или иным равнозначным доказательством юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения, доверенность на своего представителя, легализованные в установленном порядке, с нотариально удостоверенным переводом на русский язык;
– ИП: копия свидетельства о государственной регистрации и подлинник для заверения копии организатором аукциона;
– представителем гражданина Республики Беларусь, ИП: нотариально удостоверенная доверенность;
– представителем иностранного физического лица, индивидуального предпринимателя (нерезидентов Республики Беларусь): легализованная в установленном порядке доверенность с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык;
победителем признается участник торгов, предложивший наиболее высокую цену;
заключение договора купли-продажи осуществляется в течение 5 (пяти) рабочих дней с дня проведения торгов;
победителю торгов, выразившему согласие на заключение договора купли-продажи, задаток не возвращается и учитывается при окончательных расчетах за приобретаемый предмет торгов;
в случае если торги признаны несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, предмет аукциона продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 (пять) процентов;
победитель/единственный участник торгов, выразивший согласие на покупку предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 (пять) процентов, оплачивает цену за вычетом суммы внесенного задатка в течение 10 (десяти) календарных дней с момента заключения договора купли-продажи, если иной срок для оплаты не определен соглашением сторон

**Получить дополнительную информацию о порядке проведения аукционов можно по телефонам: +375 (44) 5986627, 8 (017) 3480699.**
**Ознакомиться с предметом аукциона можно по месту его нахождения после предварительного согласования по тел. +375 (33) 6351122**

## Гродненский филиал
## РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ О ПОВТОРНОМ АУКЦИОНЕ

ЛОТ 1: капитальное строение, инв. № 430/С-39158 (назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – магазин), общей площадью 238 кв. м, расположенное по адресу: г. Новогрудок, ул. Минская, 3. Капитальное строение, инв. № 430/С-39158, является историко-культурной ценностью. Обременения со стороны третьих лиц: в виде аренды части здания (помещения площадью 13,1; 151,0; 31,7 кв. м) сроком до 30.04.2019 г.

Лот № 1 расположен на земельном участке, кадастровый номер 424350100001000538, площадью 0,0438 га (назначение – обслуживание здания магазина) по адресу: г. Новогрудок, ул. Минская, 3.

Начальная цена продажи – 175 200 руб. (сто семьдесят пять тысяч двести рублей) с учетом НДС.

Сумма задатка – 17 520 руб. (семнадцать тысяч пятьсот двадцать рублей).

Продавец – Открытое акционерное общество «Детский мир РТ», 231400, г. Новогрудок, пл. ленина, 1, тел. 8-01597-206-10

Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 45-05-38, 41-98-32

Условия проведения аукциона – сохранение историко-культурной ценности объекта. Условия оплаты – по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона

Номер р/с для перечисления задатка – р/с BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

**Аукцион состоится 27 февраля 2019 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3**

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами: заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка; *физическим лицом* – паспорт (документ, его заменяющий) и его копия; *юридическим лицом и ИП – резидентами Республики Беларусь* – заверенные копии учредительных документов; *юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.
При подаче документов на участие в аукционе представителем организатору аукциона предъявляется документ, подтверждающий полномочия представителя, и документ, удостоверяющий его личность. Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатор аукциона извещает участников аукциона. Продавец имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным.
В процессе торгов начальная цена повышается в соответствии с шагом аукциона аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.
Срок возмещения затрат на организацию и проведение аукциона – 3 рабочих дня.
**Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 01.12.2018 г.**

**Заявления на участие принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30. до 16.30 (пятница). Последний день приема заявлений – 21 февраля 2019 г. до 15.00**

*Телефон для справок: 45-05-38 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» http://grodnoino.by*

Сугучча

**Рэдактар «Литературной газеты» Максім ЗАМШАЎ:**

# «Мне падабаецца Купалава свабода ў думках, часам нават дзёрзкасць...»



Фота Андрэя САЗОНАВА.

## ДАСЬЕ

Максім Замшаў — паэт, празаік і крытык, сябра Саюза пісьменнікаў і Саюза журналістаў Расіі, уладальнік пяці літаратурных прэмій, аўтар 10 зборнікаў паэзіі і чатырох кніг прозы. Яго кнігі друкаваліся ў Расіі, Балгарыі, Сербіі, Македоніі, Румыніі, Азербайджане, Грэцыі, а творы перакладаліся на 15 моў свету. З 2017 года рэдагуе «Литературную газету», а таксама ўваходзіць у савет літаратурнай прэміі «Ліцэй» для маладых аўтараў.

**Як ужо згадвала «Звязда», знакаміты цыкл Янкі Купалы «Санеты» атрымае новае дыханне — у перакладах на больш як 20 моў свету, якія складуць другое перавыданне паэтычнага зборніка. Кніга рыхтуецца да друку ў выдавецтве «Мастацкая літаратура» і выйдзе гэтай восенню, але з некаторымі варыянтамі перакладаў можна пазнаёміцца ўжо сёння. Прыкладам, «Санеты» на рускай мове ў канцы студзеня былі апублікаваны ў расійскай «Литературной газете», а зусім нядаўна гучалі на пляцоўках Мінскай міжнароднай кніжнай выстаўкі-кірмашу. Пра асаблівасці лірыкі і тонкасці мастацкага перакладу «Звязда» распытала яго аўтара, галоўнага рэдактара «Литературной газеты» Максіма Замшава.**

— Чаму менавіта Купала? Перадусім таму, што гэта адна з ключавых, знакавых постацей у беларускай літаратуры і культуры — гэта, так бы мовіць, эстэтычная прычына. Ну і больш прыземленая — рэалізацыя сумеснага праекта «Санеты» на мовах свету», арганізатары якога прапанавалі мне ажыццявіць рускі пераклад.

***— Вы займаліся паэтычным перакладам і з іншых моў...***

— Так, з румынскай, балгарскай, македонскай — славянскія мовы, дастаткова блізкія па гучанні, формаўтварэнні, і нават не ведаючы мовы, ты разумееш, як у ёй усё ўладкавана.

***— У вас за плячыма не толькі літаратурная адукацыя (Літінстытут імя М. Горкага), але таксама чырвоны дыплом, атрыманы ў музычным вучылішчы імя Гнесіных. Музычная адукацыя і досвед дапамагаюць славіць, зразумець мелодыку іншых моў?***

— Не магу адказваць за ўсіх паэтаў і перакладчыкаў, але асабіста мне сапраўды гэта дапамагло. І справа нават не ў тым, што ты чуеш і адчуваеш, а ў тым, што музычная адукацыя дазваляе зразумець форму і рытм, суадносіны частак у цэлым творы... Словам, так, для мяне гэта адназначна плюс.

***— У літаратурных колах давodзілася чуць меркаванне, што адэкватна перакласці паэтычныя радкі на іншыя мовы, захаваўшы і сэнс, і рыфму, і метафары, можа не перакладчык, а толькі іншы паэт...***

— На мой погляд, гэта даволі складаны момант, бо ў гісторыі літаратуры былі перакладчыкі, як, напрыклад, Вільгельм Левік, які не быў такім ужо знакамітым паэтам, але рабіў насамрэч выдатныя пераклады, адметныя высокай культурай і дакладнасцю ў перадачы арыгінала. І хоць паэту насамрэч лягчэй адчуць нейкія ўнутраныя рэчы, чым чалавеку, які проста добра ведае замежную мову, але трэба быць вельмі асцярожным, каб паэта не занесла ўдалечынь і не атрымалася яго ўласная версія твора, падобных прыкладаў мы таксама ведаем нямала.

***— Ці з'явіўся ў вас падчас працы любімы купалаўскі санет?***

— Усе санеты вельмі падабаюцца, не магу вылучыць і назваць нейкі адзін. А вось тое, што мне спадабалася наогул у творчасці Купалы, — гэта спалучэнне, з аднаго боку, класічнасці вершаванага строю, а з другога, вялізная свабода ў думках, часам нават дзёрзкасць.

Магчыма, мне складана назваць адметныя рысы Купалы менавіта як беларускага паэта — усё ж, хоць ён пісаў на беларускай мове, але знаходзіўся ў агульнай сістэме духоўных каштоўнасцяў. Таму ў гэтым цыкле відавочна сімвалічнае адчуванне свету, я сказаў бы, рамантычны сімвалізм, які быў на той час сусветнай паэтычнай тэндэнцыяй. Але разам з тым у купалаўскіх вершах вельмі многа канкрэтных указанняў на жыццё менавіта беларускага народа, і гэта датычыцца не толькі ўмелага апісання прыгажосці беларускай прыроды, але і жыццёвых гісторый, перадачы цяжкай сялянскай долі, прыгнечанасці... На мой погляд, усё гэта вельмі цікава з пункту гледжання не толькі літаратуры, але і гісторыі.

Калі праект атрымае працяг, безумоўна, было б вельмі цікава ўзяцца за вершы Максіма Багдановіча, але гэта надта аддаленыя перспектывы, каб іх зараз усур'ёз абмяркоўваць. Пакуль жа варта не забывацца і на ўласную літаратурную работу: нядаўна скончыў раман, цяпер яго дапрацоўваю і рэдагую, потым спадзяюся год ад вялікай прозы адпачыць. Зразумела, хочацца працягваць пісаць вершы, і хоць тут цяжка гаварыць пра нейкія планы, але ў мяне ёсць пэўныя абавязацельствы перад выдаўцамі Казахстана, дзе рыхтуюць зборнік рускай паэзіі, і, вядома, адна з галоўных задач — каб жыла і развівалася «Літературная газета», каб павялічваўся яе тыраж і на старонках з'яўлялася як мага больш цікавых матэрыялаў.

**Гутарыла Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

**Прачытаць «Санеты» Янкі Купалы ў перакладзе Максіма Замшава можна па спасылцы http://www.lgz.ru/article/-4-6676-30-01-2019/lyubite-budushchee-mirozdanya/?sphrase_id=2316038**

## БЛІЦ «ЗВЯЗДЫ»

***— Хто з сучасных аўтараў вам блізкі?***

— Чытаю запоем, вельмі шмат — калі ты знаходзішся ў літаратурным полі, то проста абавязаны ведаць, што пішуць твае калегі. З апошніх навінак вельмі спадабаўся раман Яўгена Вадалазкіна «Брысбен», які выйшаў вялікім для цяперашняга часу тыражом у 35 тысяч асобнікаў. Стараюся не прапускаць новых рэчаў Дзмітрыя Быкава, таксама сачу за творчасцю маладых аўтараў, якіх вельмі многа.

***— Якую кнігу можаце перачытваць шмат разоў?***

— «Майстар і Маргарыта» Міхаіла Булгакава, дзе кожны раз знаходжу для сябе штосьці важнае.

***— Лепш чытаць з гаджэта альбо на паперы?***

— Важна, які тэкст чытаеш, а ў электронным або папяровым фармаце — справа другасная. Асабіста я прыхільнік папяровых кніг: у іх, у адрозненне ад гаджэтаў, не скончыцца зарад батарэі, бо яны, як стагоддзямі выпрацаваная форма, прызначаны менавіта для чытання, а смартфоны і планшэты ўсё ж прыдуманы для іншых рэчаў.

***— Перш чым пачаць пісаць, трэба...***

— Чытаць. Як мага больш чытаць. Без ведання таго, што адбылося ў сусветнай літаратуры да цябе, без пэўнага літаратурнага багажу нельга зрабіць нічога вартага.

НА КОНКУРС АПАВЯДАННЯЎ

**«Гэтае апавяданне пра маленечкую вёсачку, якая ў нечым нагадвае маю, дзе прайшло маленства», — прызнаецца ў сваім лісце ў рэдакцыю Расціслаў Бензярук з Жабінкі. Што ж, магчыма, таму яно атрымалася такім лірычна-шчымлівым. А ўвогуле, шкада, што ў беларускай прозе, якую некалі называлі вясковай, апошнім часам не вельмі шмат з'яўляецца цікавых (так і хочацца дадаць: дый увогуле не вельмі шмат) твораў пра сучасную вёску. Яно зразумела: сёння ў літаратуру прыходзяць ужо часцей з горада, чым з вёскі, а маладзейшыя аўтары гэтую тэму лічаць не вельмі актуальнай, цікавай. «Рэтра», адным словам. А можа проста, як пісаў у свой час Рыгор Барадулін, «трэба дома бываць часцей»? Тады і з'явяцца цікавыя сюжэты, прыдатныя не толькі для аўтараў традыцыйнай прозы, але і для тых, хто ў сваёй творчасці ідзе на самыя смелыя літаратурныя эксперыменты.**

**Алесь БАДАК.**

Расціслаў БЕНЗЯРУК

# ДЗЕНЬ ПЕРАД ІМЯНІНАМІ

СТАЙКІ заўсёды былі невялічкай вёсачкай — усяго дзевятнаццаць хат. Ні школы, ні крамы. Праўда, калі Гаўрык Грамыка бегаў у суседнія Гамаі ў школу-сямігодку, у ягоных Стайках жыло чалавек да сямідзесяці, было шмат дзяцей. Дарога ішла праз лес, і дабіраліся вялікай гурмой.

Пасля вайны вучылася многа пераросткаў. Асабліва даймаў Гаўрыка вярзіла Ігнат Стральчук. Урокі беларускай мовы і літаратуры вёў Іван Вікенцьевіч. У яго была свая манера выклікаць вучня да дошкі. Іван Вікенцьевіч пачынаў, расцягваючы кожнае слова:

— Сёння пойдзе... пойдзе адказваць... — рабіў вялікую паўзу, а затым імгненна, бы выстрэльваў: — Грамыка Гаўрыла.

— Гаўрыіл, — аднойчы папраўвіў настаўніка Гаўрык.

— Па-руску Гаўрыіл, а пабеларуску — Гаўрыла.

А на перапынку Ігнат пацвяліў хлопца:

— Назаві імя, дзе ёсць помесь сабакі і свінні!

— Якая помесь? — не зразумеў Гаўрык.

— Гаў і рыла. Гы-гы-гы! — зарагатаў нахабнік.

Ад абразы Гаўрык кінуўся на крыўдзіцеля з кулакамі, але той, паказваючы сваю сілу, у адзін момант адфутболіў меншага, так што ён аказаўся на зямлі. Другі раз Ігнат зноў пасмяяўся з Гаўрыка:

— Скажы, чаму гром мыкае, а не грукоча. Ён што, цяля? Гы-гы!..

Гаўрык зразумеў, што вярзіла здзекуецца з ягонага прозвішча Грамыка, ды ўступаць з ім у бойку не стаў, але дома з крыўдай спытаў бацьку:

— Тата, чаму такое непрыгожае імя мне далі?

Міхась Гаўрылавіч здзівілена паглядзеў на сына і не пагадзіўся:

— Чаму непрыгожае?.. Харошае імя! Быў святы Гаўрыіл, дый твайго дзеда Гаўрылам звалі.

— Лепей ты мяне сваім імем назваў бы! — уздыхнуў Гаўрык.

Пасля сёмага класа, каб не ехаць у райцэнтр, дзе была сярэдняя школа, ён папрасіўся прычэпшчыкам да суседа-трактарыста. Пасля скончыў вучылішча механізацыі і да пенсіі працаваў у полі.

Ігнат так і не асіліў сямігодкі і ўсё сваё жыццё пасвіў калгасны статак. Як многія мясцовыя скотнікі, прылаўчыўся да чаркі, піў усё, што, як кажуць, гарыць, і вось ужо гадоў дзесяць ляжыць у Камаях на кладах. Тая дзіцячая крыўда даўно прайшла, і Гаўрыла Міхайлавіч, калі прыходзіць на жончыну магілу, наведвае і Ігнатаву.

...У Грамыкі даўно выпрацаваўся свой распарадак дня: зімой спіць доўга, рэдка запальвае святло, а летам устае да ўсходу сонца.

Яшчэ ў пасцелі Гаўрыла Міхайлавіч прыгадаў, што павінна зайсці суседка Антося Закрэўская па курыныя яйкі, бо ў старой у адну ноч тхор задавіў усе чубаткі.

Паміж Гаўрылам і Антосяй было яшчэ хат дзесяць, і лічаць яны сябе суседзямі гадоў пяць, як засталіся толькі ўдваіх у вёсцы.

— Мы з табою, Гаўрыла, як вартаўнікі! — смяялася бяззубым ротам старая Антося. — Ты з аднаго боку сочыш, а я — з другога...

Хоць сачыць, па сутнасці, не было за кім: рэдкі госць зазірне ў вёсачку, дзе жывуць двое старых.

Грамыка паспеў абкасіць узмежак і яйкі сабраць, перш чым прыйшла суседка.

— Няўжо толькі пракінулася? — здзівіўся Гаўрыла Міхайлавіч.

— Не было каму пад бок штурхнуць, каб прачнулася, — усміхнулася ў адказ старая.

— А я табе свежанькіх яечак сабраў. Ці многа будзеш браць?

— Дзясятак. Хопіць пакуль. Колькі будзе каштаваць?

— Паўтара рубля.

— Чаму так дзешава? — перапытала суседка. — У краме даражэй.

— Вось і прадаю табе танна, каб у магазін не бегала.

— Ногі ўжо не носяць, каб у Камаі бегаць, — уздыхнула Антося. Яна дастала пяць рублёў і папрасіла: — Рэшту не давай. Як пойдзеш да аўталаўкі, вазьмі мне хлеба і масла.

Машына з прадуктамі і таварамі заязджала ў Стайкі двойчы на тыдзень. Зараз, як ішоў на месца, дзе спынялася аўталаўка, Гаўрыла Міхайлавіч раптам успомніў, што заўтра для яго будзе не зусім звычайны дзень, а імяніны: якраз спаўняецца семдзесят сем гадоў. Дзве сямёркі — гэта як круглая дата! Чакаць гасцей, аднак, не выпадала: будзень, усе на працы. «Хоць бы сын Алег пазваніў», — падумаў ён.

Аўталаўка прыехала без спазнення. Прадавец Клава прывітала бачыць Гаўрылу разам з Антосяй і зараз пацікавілася:

— Гаўрыла Міхайлавіч, а дзе суседку згубілі?

— Прыхварнула яна. Дык я ёй хлеба і масліца вазьму.

— Правільна, выручайце суседку! — ухваліла Клава.

Набіраючы прадукты, Гаўрыла Міхайлавіч купіў пляшку дарагога віна ў незвычайна вычварнай бутэльцы. «Калі хто-небудзь заўтра забрыдзе, пачастую!» — вырашыў ён, разлічваючыся за пакупку.

Пасля абеду прылёг на канапу, уключыў тэлевізар. Паказвалі канцэрт. Маладыя, звонкія галасы спявалі песню Лучанка:

«Мой родны кут, як ты мне мілы!..

Забыць цябе не маю сілы!»

«Чаму няма сілы ім забыцца? Забываюць, яшчэ й як!.. — уздыхнуў стары. — І хто ім тыя гарады мёдам намазаў?! Толькі апёрыцца — і ў горад...»

Гаўрыла Міхайлавіч выключыў тэлевізар і задрамаў. Пасля аж да цемнаты ён корпаўся ў двары: нешта пераносіў, перастаўляў. Прыбіў лыштвіну ў драбіне, па якой куры залятаюць на седала. «Ці не певень паламаў?» — усміхнуўся сваім думкам стары.

У палескай вёсачцы заканчваўся яшчэ адзін звычайны дзень. Гаўрыла Міхайлавіч даўно ўжо вырашыў для сябе: трэба адзначыць імяніны, і ён возьме тую пляшку віна, што сёння купіў, пойдзе да Антосі Закрэўскай, пасядзяць, паўспамінаюць маладыя гады. А там і Алег пазвоніць, павіншуе: ніколі ж не забываў бацькавага дня нараджэння, не павіне і зараз. Вось гэта будзе шчасце!..

Слоўніца

# АСАБЛІВАСЦІ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ РЫБАЛКІ

**Напэўна, у кожнага з дзяцінства застаюцца свае ўспаміны пра рыбалку. Хто сядзеў з вудай, хто ставіў на ноч пасткі, а хто суправаджаў дарослых, калі яны боўтам заганялі рыбу ў сетку. Мой бацька лавіў рыбу рукамі — выцягваў з-пад карчоў, карэння дрэў. На яго «майстар-класы» збіралася ўся дзятва. Маленькія памочнікі беглі па беразе з вядзерцам і чакалі, пакуль ім выкінуць чарговую злоўленую рыбку. А бацька ішоў па рацэ: ён заўсёды абуваў стаптаныя чаравікі, каб не параніць ногі, ды надзяваў вопратку, якой не шкада. Малыя глядзелі, як ён муціў ваду, запаміналі, у якіх месцах можа стаяць здабыча, даведваліся пра тое, якая раней тут вадзілася рыба... Сёння на нашай рацэ дзятва ўжо не рыбачыць, берагі зараслі так, што ўздоўж ракі ўжо не пабегаеш, ды наогул цяжка знайсці месца, дзе можна падысці да вады. Можа, таму сёння мне так цяжка на лета завабіць сваіх дзяцей на вёску...**

На жаль, калі ездзіш па Беларусі, часта чуеш: «А ў нас раней...» І калі людзі ўспамінаюць пра рыбалку, разнастайныя прылады, спосабы лоўлі, разумееш: вось яна — страчаная рамантыка. Археалагічныя знаходкі сведчаць, што рыбу на нашай тэрыторыі лавілі яшчэ з часоў палеаліту. А з сярэдніх вякоў стала развівацца рыбаводства. У статуце Вялікага Княства Літоўскага нават былі прапісаны пакаранні за самавольную лоўлю.

Пра асаблівасці нацыянальнай рыбалкі можна даведацца і з друкаваных крыніц. Так, «Лексічны атлас беларускіх народных гаворак» падказваж, як у розных мясцінах рыбакі называлі свае прылады: рыбалоўная крыга *(кломля, клоўня, комля, брэдзень, бродзень, браднік, брот, трайнік, трайчак, гегні)*, венцер *(нерат, нярот, мерат, нарот, нарот, вінцір, яцер, верша, жак, кош, буч, буча)*, кручок у вудцы *(зазубень, зазубец, гачок, вудка, зачэп)*, жак *(венцер, мярожа, нерат)*, абруч у венцеры *(бруч, обруч, каблук, камлук, закаблук, каблуч, калач, лук, дуга, дужка)*, палатно для рыбалоўных сетак *(сець, сетка, ценета, рэдзь, рэзь, рэж)*.

Па-рознаму называлі і рыбу. Шчупак *(шчука, кожушок, кожушка)*, мянтуз *(мінтуз, мень, мінёк, мяк, калека, вягал)*, ёрш *(ерш, яжгур, яджгур, саплівец, слюнька, слюньцяй, сморкач)*, уюн *(віюн, ваюн, вілюн, юн, піскун, піскур, сліж, слíжык, кроўж)*, вугор *(вугар, вугорыя, бугор, вангор, вэнгор, даўгар)*. Шчупака, які ідзе на нераст у сакавіку, маглі зваць *марцоўкай*, у красавіку — *апралёўкай*. *Каласавіком* звалі ляшча, які нерастуе ў час каласавання жыта.

— У мове зафіксавана многа. Вучонымі праводзіліся даследаванні, звязаныя з рыбалоўствам, друкаваліся спецыяльныя падборкі слоў. Напрыклад, з этнаграфічных і лексічных выданняў можна даведацца, якія прылады выкарыстоўвалі на Беларусі, — расказвае **Вераніка КУРЦОВА, загадчык аддзела дыялекталогіі і лінгвагеаграфіі Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі.** — Людзі, якія спакон веку жылі каля ракі, яшчэ і сёння могуць багата расказаць. Яны ведаюць, дзе, што і ў які час трэба ставіць, як прабіваць палонку (часта называюць яе пелькаю). Напрыклад, мы ездзілі ў Верхнядзвінскі раён. Там велічэзнае Асвейскае возера, багатае на рыбу. У гэтых мясцінах былі вялікія рыбалавецкія арцелі, і не толькі мужчыны займаліся рыбалоўствам.

Мы былі ў вёсцы, што называецца Вялікае Сяло, запісвалі жанчыну, якая сама хадзіла і лавіла рыбу. Яна расказвала так захапляльна, настолькі ведала рыбалавецкую справу, што мы дзіву даваліся.

А калі сунуліся ў іншую хату і хацелі спытаць мужчыну зноў жа пра мясцовыя традыцыі ў рыбалоўнай справе, то нічога не пачулі: наш моўца такой інфармацыяй не валодаў. Зразумела, чалавек, які хадзіў улетку сабе пару рыбін злавіць, многа не раскажа. Веды ж прафесійных рыбакоў куды шырэйшыя.

***— Але, напэўна, сёння вучоным не так проста адшукаць такіх?***

— На жаль, традыцыйныя рамёствы адыходзяць, і разнастайнай інфармацыі ўжо не атрымаеш. Дыферэнцыяцыя па занятках была натуральна абумоўленая. Так, хлеб і бульбу вырошчвалі ўсе, ці кожная жанчына прала, а вось валёнкі мог біць адзін чалавек. Не ўсе былі цеслярамі. Каб паставіць хату, патрэбны вопыт і ўменне, таму рубілі яе толькі асобныя людзі. І гэта вялікае шчасце, калі ўдаецца натрапіць на майстроў, якія самі займаліся пэўнымі рамёствамі.

Доўгія гады вучонымі збіраліся спецыяльныя групы лексікі. Напрыклад, у 60-я праводзіліся экспедыцыі пад кіраўніцтвам Мікіты Талстога на Палессе. Тады была сабрана багатая інфармацыя па розных лексіка-тэматычных групах палескай рэгіянальнай лексікі. Гэта назвы хаты і іншых гаспадарчых пабудоў, пчалярства, ткацтва, адзення і абутку і іншыя тэматычныя слоўзборы.

Добра апісана ў слоўніках, паказана на картах тое, што звязана з земляробствам, традыцыйным харчаваннем. Зараз мы рыхтуем адметны слоўнік, які будзе называцца «Плытагонства». Раней гэта было натуральнай справай — ганяць плыты: Беларусь уся ў рэках і азёрах. Асабліва шырока плытніцтва было развіта ў другой палове XIX стагоддзя: развіваўся гандаль з Захадам, і плытагонства для многіх стала дадатковым спосабам зарobку.

Вялікая колькасць людзей займалася гэтым у басейнах Дняпра, Нёмана, Заходняй Дзвіны, Прыпяці, найперш там, дзе былі вялікія сплаўныя рэкі. Да слова сказаць, плыты ганялі і па малых рэках, але галоўным месцам, дзе звязваліся плыты ў караван, былі, натуральна, толькі вялікія рэкі. Мы паспрабавалі сабраць усё, што было звязана з плытагонствам і адлюстравана ў розных навуковых ці інфармацыйных крыніцах. Ганяць плыты — гэта ж не проста звязаць некалькі дрэў разам. Існавала многа дадатковых аперацый.

***— Ці варта скіраваць краязнаўцаў і грамадскія арганізацыі, якія ладзяць этнаграфічныя экспедыцыі па Беларусі, адначасова збіраць і «моўную спадчыну», цікавіцца асаблівасцямі гаворак у пэўных рэгіёнах?***

— Гэта добра, што ёсць кола маладых людзей, якія цікавяцца не толькі адметнымі падзеямі, датамі, лёсамі канкрэтных асоб ці, напрыклад, «палююць» на песні. Яны разумеюць каштоўнасць вуснай гісторыі. І чым больш будзе запісана, тым большая ім хвала. Мы захаваем для нашчадкаў неверагоднейшае багацце. Зможам пачуць жывое слова, даведацца, як складваўся традыцыйны побыт, як продкі пазнавалі і бачылі свет.

У час такіх падарожжаў можна сустрэцца з унікальнымі асобамі. Але трэба яшчэ ўмець весці размову так, каб адшукаць пэўную інфармацыю. І добра было б, каб перад экспедыцыяй патрымаць у руках апытальнікі, вызначыць мэты, дзеля якіх чалавек выпраўляецца ў такое падарожжа. Напрыклад, можна арыентавацца на матэрыялы Лексічнага атласа і спрабаваць папрацаваць з тымі ж тэмамі, паглыбіцца ў іх. У выніку чалавек, які цікавіцца родным краем, зможа сабраць сапраўды каштоўны матэрыял.

У нас яшчэ можна пачуць традыцыйную гаворку, цалкам натуральную, аблічча якой на фанетычным і граматычным узроўнях мала адрозніваецца ад яе стану на пачатку XX стагоддзя. У многіх еўрапейскіх краінах такога ўжо няма. Радуе, калі ў інтэрнэце выстаўляюць падобныя гукавыя запісы, моладзь захапляецца гаворкамі. І важна гэтую ініцыятыву вітаць.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Спытайце пра радзіннае

## Ад чаго аберагае грамнічная свечка?



**Пытанне з Магілёва ад нашай чытачкі Марыі Васілеўны: «15 лютага — свята Грамніцы. Бабуля вучыла абавязкова ў гэты дзень пайсці ў храм і набыць свечку, якую яна называла «грамніца». Адкуль пайшла гэта традыцыя?»**

Давайце разбірацца. Грамнічная свечка спалучыла ў сабе сімволіку двух гісторыка-культурных традыцый. Святло абрадавай свечкі ачышчала перад чалавекам шлях, нейтралізоўвала перашкоды, была той пуцяводнай зоркай, што ўказвала не толькі сцежкі-дарожкі сёнцяшняга дня, але і на ўсім жыццёвым шляху.

Звычайна свечкі-«грамніцы» людзі рыхтавалі загадзя. Тыя, хто трымаў пчол, выплаўлялі самыя вялікія свечкі, у каго іх не было — куплялі жоўты воск у краме або знаёмых пчаляроў. Беларускі этнограф М. Я. Нікіфароўскі адзначаў, што грамнічныя свечкі былі «такога памеру, які дазваляў бы схаваць яе на грудзях пад верхняй вопраткай або ў рукаве і такім чынам утаіць ад чужых прысутнасць свечкі». Ён жа адзначаў, што тыповыя памеры былі наступныя: даўжыня павінна быць прыкладна дзесяць вяршкоў (44 см), а таўшчыня — тры чвэрці вяршка (каля 3,5 см). Такія памеры былі абумоўлены практычнай гаспадарчай дзейнасці і той колькасцю абрадавых сітуацый, у якіх грамнічная свечка выступала ключавым атрыбутам: свечку-грамніцу ўкладвалі ў рукі цяжка хвораму чалавеку; «грамніцай» блаславілі сына-жаніха і дачку-нявесту; «грамніцу» запальвалі падчас нараджэння дзіцяці і г. д. Сёння хіба толькі пчаляры здольныя зрабіць сапраўдную свечку-грамніцу. Часцей за ўсё свечкі купляюць у храмах.

З моманту асвячэння ў храме або правядзення адпаведнага рытуалу дома той ці іншы святочны атрыбут ператвараўся ў сакральную рэч. Да ліку сакральных атрыбутаў адносілася і грамнічная свечка. На працягу года яе захоўвалі на покуці за абразамі або ў куфэрку, трымалі далей ад чужых вачэй, каб ніхто не ведаў, дзе яна прыхавана, і нават не здагадваўся, што яна ёсць у хаце.

Старыя людзі раілі: **«Грамнічная свечка не падлягае пазычанню, як і агонь, нават у блізкія дамы сваякоў, родным асобам, што жывуць у іншай сям'і».**

Пасля вяртання з храма ў хаце адбываўся абавязковы абрад агністага крыжавання. Спачатку крыжападобна лёгенька абпальвалі валасы гаспадару, потым жонцы, далей усім астатнім членам сям'і па ўзросце, па чарзе. Пасля «вогненнага асвячэння» дамачадцаў бацька абыходзіў усе куты хаты, гаспадарчыя пабудовы, за выключэннем лазні. Знакам «выпальвання» заставаліся чорныя крыжы на бэльках або дзвярах. У некаторых рэгіёнах выконвалі наступнае рытуальнае дзеянне: **у хлеў неслі грамнічную свечку і разломвалі-разразалі яе на столькі частак, колькі жывёл там было. Лічылася, што такое дзеянне надзейна ахоўвае свойскую жывёлу ад сурокаў.**

Традыцыя забараняла ў гэты дзень адпраўляцца ў далёкую дарогу. Напрошваецца прамая аналогія з Калядамі, калі ў першы вечар пажадана было ўсім сядзець за сямейным сталом. Праз кароткі прамежак часу пачнецца Вялікі пост, таму лічылася абавязковым сем разоў паесці ў гэты дзень.

У дзень Грамніц у храмах асвячалі не толькі свечкі, але і ваду. Па ступені значнасці грамнічная вада лічылася на адным узроўні з той, якую бралі на Вадохрышча.

Аднак **найбольш моцным абярэгам грамнічную свечку лічылі ў час летняй навальніцы.** Тое, што нарадзілася ад нябеснага агню, тое, што асвечана царкоўным абрадам, станавілася своеасаблівым гарантам перасцярогі. Свечку-грамніцу ставілі на падаконнік пры набліжэнні навальніцы, запальвалі яе. Лічылася, што яна адвядзе ад хаты нябесны агонь.

**Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.**

***Дасылайце свае пытанні аб каранях і прыстасаванасці да сучаснага жыцця каляндарных і сямейна-побытавых народных традыцый і абрадаў на паштовы або электронны адрас рэдакцыі з пазнакай «Пра радзіннае».***





# ФОТААРХІЎ дзядзькі Антона

Днямі ў рэдакцыю нашай газеты завітаў пажылы мужчына з кіёчкам і невялічкай сумкай. Адрэкамендаваўся: «Антон Ліпніцкі. Мінчанін. Пенсіянер».

Мы прыселі побач у крэслы. Праз хвілінку на часопісны столік госць «Звязды» выклаў прынесеныя ў сумцы старыя фотаздымкі. Маленькія і вялікія, надрукаваныя на фотапаперы, — яны падаліся стракатымі лісточкамі даўняга календара. Нагадаўся мінулы час без мабільных тэлефонаў і камп'ютараў, калі фотаздымак узнікаў перад намі не электроннай выявай на экране, а рэальна існуючым на цвёрдай, але гнуткай кардонцы.

— Я сорак гадоў працаваў з фотаапаратамі ў руках, — расказваў наш госць. — Дапамагаў афармляць кнігі, часопісы, стэнды. Пабываў у многіх гарадах і вёсках. Адным словам — фіксаваў дасягненні народнай гаспадаркі. Мноства маіх здымкаў адышло ў мінулае, знікла там бясследна...

Але ж высветлілася, што па сваіх страчаных фотаработах мой суразмоўнік не надта сумуе, бо ў хатнім архіве засталіся тыя, што калісьці ён рабіў «для душы». Сярод іх — фота родных і знаёмых, пейзажы беларускіх месцін, заўважаныя пільным вокам фотамайстра смешныя сітуацыі з гарадскога жыцця.

З фотаархіваў старога майстра знаёмыя ўсе жыхары яго пад'езда ў шматпавярховым доме. Кабіну ліфта (не парушаючы правілаў карыстання тэхнікай!) дзядзька Антон упрыгожыў сваімі каляровымі фотапейзажамі — глядзіце, суседзі, якая прыгожая наша зямля!

Некаторыя вясёлыя сюжэты, знятыя Антонам Ліпніцкім з дапамогай простага плёначнага фотаапарата, мы вырашылі паказаць чытачам «Звязды». Робім такое, каб зноў пацвердзіць выснову: сапраўдны гумар ніколі не старыцца, нават калі аўтару гэтых вясёлых сюжэтаў ужо за дзевяноста гадоў.

Днямі я завітаў да дзядзькі Антона і сфатаграфаваў яго на прагулцы каля рэчкі, у незвычайнай «выставачнай зале» ліфта, у час размоў-успамінаў з жонкай Галінай над здымкамі сямейнага архіва.

**Яўген ПЯСЕЦКІ.**






Казкі Мінскага мора.

*Скарыстайцеся вашым смартфонам, каб адсканаваць QR-код і ўбачыць больш фота.*

**Сваім фотаздымкам дзядзька Антон даў наступныя назвы:**



Жыў у бабулі беленькі козлік...



Барсік — сябра рыбалова.



Яна зноў не прыйшла.

## Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» сообщает о проведении 26.03.2019 открытого аукциона

Лот № 1: **Право заключения договора аренды помещений общей площадью 20,6 (в т. ч. 14,4; 4,2; 0,8; 1,2) кв. м,** расположенных на первом этаже капитального строения с инв. № 700/С-14699 – здание районного узла почтовой связи, по адресу: г. Могилев, ул.Челюскинцев, 149. Срок предоставления права аренды – 5 лет.

***Начальная цена продажи: 82,97 бел. руб. Сумма задатка: 8,3 бел. руб.***

Лот № 2: **Право заключения договора аренды помещения площадью 49,1 кв. м,** расположенного на первом этаже капитального строения с инв. № 700/С-66111 – крытая стоянка, по адресу: г. Могилев, ул.Челюскинцев, 149. Срок предоставления права аренды – 5 лет.

***Начальная цена продажи: 197,75 бел. руб. Сумма задатка: 19,78 бел. руб.***

**Аукцион состоится 26 марта 2019 года в 12.00** по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352. Последний день подачи заявок и внесения задатка: 25 марта 2019 года до 15.00. Аукцион может быть отменен в любое время, но не позднее, чем за три дня до даты аукциона

**Расчетный счет для внесения задатка:** получатель платежа – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182, р/с IBAN BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, BIC банка BPSBBY2X

**Продавец:** Могилевский филиал РУП «Белпочта, УНП 700838286, г. Могилев, ул. Первомайская, 28, тел. 22-97-86

**Организатор аукциона:** Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182, г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352, тел. +375 222 72-41-14

**Порядок проведения аукциона:** для участия в аукционе приглашаются резиденты и нерезиденты Республики Беларусь, которые внесли в установленном порядке задаток для участия в аукционе, своевременно подали заявление на участие в аукционе со всеми необходимыми документами, заключили с Организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон. Лоты продаются без условий на открытом аукционе с применением метода повышения начальной цены, с шагом пять процентов от предыдущей названной аукционистом цены. Победителем аукциона признается участник, предложивший наивысшую цену. Единственный участник имеет право приобрести объект продажи по начальной цене, увеличенной на 5 %

**Срок и условия оплаты:** победитель аукциона возмещает затраты на организацию и проведение аукциона в течение 3 (трех) рабочих дней со дня проведения аукциона в соответствии с выдаваемым счетом-фактурой. В течение 5 рабочих дней со дня подписания протокола аукциона Победитель перечисляет на расчетный счет Продавца цену продажи предмета аукциона за вычетом задатка. Задаток, внесенный для участия в аукционе Победителем аукциона, засчитывается в счет уплаты за предмет аукциона. Победитель аукциона обязан в течение 5 (пяти) рабочих дней со дня оплаты предмета аукциона подписать договор аренды помещений

**Дополнительную информацию можно получить по тел.: +375 29 624-26-25, +37529-550-09-56**

---

**20 марта 2019 г.** **ИЗВЕЩЕНИЕ** **№ 2-Н/2019**

## о проведении аукционных торгов по продаже не завершенного строительством незаконсервированного объекта с продажей права заключения договора аренды земельного участка в г. Гомеле

| № лота | Наименование объекта / адрес земельных участков: г. Гомель | Целевое назначение | Кадастровые номера и общая площадь земельных участков | Начальная стоимость, руб. | Сумма задатка, руб. | Расходы на подготовку документации, руб. | Наличие ограничений |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Не завершенный строительством незаконсервированный объект по **ул. Кирова – Хатаевича** | Для размещения здания специализированного здравоохранения и предоставления социальных услуг, или здания специализированного финансового назначения, и (или) здания специализированного культурно-просветительного и зрелищного назначения, или здания многоквартирного жилого дома (в том числе со встроенными помещениями), и (или) здания специализированного розничной торговли, или здания гостиниц, мотелей, кемпингов, или здания специализированного общественного питания, или здания специализированного физкультурно-оздоровительного и спортивного назначения, или здания многофункционального (административные помещения, торговые помещения, помещение общественного питания). | 340100000001005445 – 0,3150 га, 340100000001005684 – 0,1456 га, **0,4606 га** | **1 925 432,88** | **50 000,00** | **1 150,20** | Охранная зона сетей и сооружений канализации, объектов газораспределительной системы, электрических сетей, линий связи и радиофикации, сетей и сооружений водоснабжения, сети и сооружения теплоснабжения |

1. Организатор аукциона – Коммунальное топографо-геодезическое унитарное предприятие «Гомельгеодезцентр» (далее – Государственное предприятие «Гомельгеодезцентр»).
1.1. **Начальная цена** предмета аукциона определена как сумма начальной цены не завершенного строительством незаконсервированного объекта согласно заключению об оценке № 166/08-18 РДУП «Гомельский институт недвижимости и оценки» в размере **1 849 071,71** рубля и начальной цены права заключения договора аренды земельных участков в размере **76 361,17** рубля, необходимого для завершения строительства и обслуживания этого объекта.
2. **Аукцион проводится комиссией, созданной Государственным предприятием «Гомельгеодезцентр», в соответствии с Положением о порядке продаже не завершенного строительством незаконсервированного объекта с публичных торгов на земельном участке в г. Гомель, предоставляемом в аренду сроком на 5 лет, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.05.2016 г. № 370.** Получить разрешение горисполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработку строительного проекта на строительство объекта, архитектурно-планировочное задание и технические условия для инженерно-технического обеспечения объекта строительства. Приступить к строительству объекта в течение шести месяцев со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство такого объекта, завершить строительство объекта в сроки, определенные проектной документацией. Желающим предварительно ознакомиться с документами обращаться в Государственное предприятие «Гомельгеодезцентр» (г. Гомель, ул. Барыкина, 149, 3-й этаж, каб. № 3–6, № 3–14).
3. **Аукцион состоится 20 марта 2019 г. в 15.00 в Гомельском городском исполнительном комитете по адресу: г. Гомель, ул. Советская, 16, каб. 115,** при наличии не менее двух участников. Если заявление на участие подано только одним гражданином, юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь, право аренды земельного участка предоставляестя этому лицу при его согласии с внесением платы за право аренды в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на **5 процентов.**
4. К участию в аукционе допускаются граждане, индивидуальные предприниматели Республики Беларусь и юридические лица, а также иностранные инвесторы (иностранные государства, объеденения, международные организации, иностранные юридические лица, иностранные граждане. В аукционе допускается участие на стороне покупателя консолидированных участников, подавших в Государственное предприятие «Гомельгеодезцентр» в указанные в извещении сроки следующие документы: заявление по установленной форме; документ, подтверждающий внесение суммы задатка в размере, указанном в извещении с отметкой банка, на **р/с BY74 BAPB 3012 2030 8001 3000 0000 в филиале ГОУ ОАО «Белагропромбанк», г. Гомель, ул. Интернациональная, 30, УНП 400230163, БИК BAPBBY2X. Получатель платежа – Государственное предприятие «Гомельгеодезцентр». Наименование платежа – оплата задатка за участие в аукционе. Кроме того, НЕОБХОДИМО открыть текущий расчетный счет (с указанием транзитного счета) в филиале ГОУ ОАО «Белагропромбанк», г. Гомель, ул. Интернациональная, 30** – для возврата задатка за участие в аукционе (в случае непобеды на аукционных торгах) – это только для физических лиц. Индивидуальные предприниматели и юридические лица производят оплату задатка со своего расчетного счета.
**Перечень документов, представляемых участником:**
4.1 Заявление на участие в аукционе; документ, подтверждающий внесение суммы задатка; гражданам РБ – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность.
4.2 Представители или уполномоченные должностные лица юридических лиц Республики Беларусь – доверенность, выданную юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;
4.3 Идивидуальные предприниматели – копию свидетельства о государственной регистрации без нотариального засвидетельствования;
4.4 Представители индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенную доверенность;
4.5 Представители или уполномоченные должностные лица иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;
5. Лицо, желающее принять участтие в аукционе, обязано подписать с организатором торгов Соглашение, определяющее взаимные права и обязанности в процессе подготовки и проведения аукциона.
6. **Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на предоставление предмета аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан:**
– в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся, в размере, определенном соответствующим протоколом аукционных торгов:
– возместить расходы, понесенные городским бюджетом по изготовлению земельно-кадастровой документации и государственной регистрации земельного участка;
